

САКРЭТЫ НЕЙРАХІРУРГА 7

ШТО ЗДЫМАЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КІНАСТУДЫЯ? 9




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 ЛЮТАГА 2019 г. СУБОТА № 27 (28894)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ШАРСНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**

*«Сёлета ў Віцебскай вобласці на развіццё эканомікі плануецца накіраваць 2,2 мільярда рублёў. Прыярытэтнымі будуць праекты па ўводзе ў эксплуатацыю новых тэхналагічных комплексаў у ААТ «Нафтан», завода па выпуску белай бляхі ў Мёрах, будаўніцтве трэцяй чаргі льнокамбіната, буйных жывёлагадоўчых комплексаў і прамысловых аб'ектаў. У фокусе ўвагі знаходзіцца таксама стымуляванне развіцця бізнесу. Сектар прадпрымальніцтва забяспечвае трэць інвестыцый і палову экспарту тавараў вобласці. Летась больш чым у два разы павялічана падтрымка прадпрымальніцтва з абласнога бюджэту. З'явілася каля 400 новых арганізацый па аказанні паслуг насельніцтву ў сферах рознічнага гандлю, грамадскага харчавання, транспарту, што дазволіла стварыць новыя рабочыя месцы».*

# НА ЛЫЖНЫ СТАРТ!



Сёння ў сталіцы сапраўднае лыжнае свята. Ужо традыцыйная лютаўская «Мінская лыжня» збірае мноства гледачоў і ўдзельнікаў. Бо гэта выдовішчна і здарова, тым больш што прыняць удзел могуць усе ахвотныя. Вось і студэнты з Кітая, якіх наш фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук нядаўна здымаў у Сілічах, запэўнілі яго, што абавязкова паўдзельнічаюць і ў сённяшніх стартах у Вяснянцы.

*(Падрабязны расклад спаборніцтваў — на 3-й стар.)*

## КОРАТКА

• **Памёр вядомы акцёр Сяргей Юрскі. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне родным і блізкім народнага артыста РСФСР.**



• Заробак медыкаў у Мінску за год вырас амаль на 26 %. У тым ліку зарплата ўрачоў перавысіла Br1205, сярэдняга медыцынскага персаналу — Br882.

• **Захваральнасць на адзёр у Еўропе летась у тры разы перавысіла паказчыкі за 2017 год і ў 15 разоў — за 2016-ы.**

Сітуацыя

# ЯБЛЫНІ РАЗЛАДУ

### Мінчане просяць не высякаць сад пад будаўніцтва забаўляльнага цэнтра

**Апошнія гады праекты забудовы сталіцы выклікаюць вялікі рэзананс сярод гараджан. Асабліва тыя, што датычацца зялёных зон. Адна з такіх спрэчных сітуацый нядаўна ўзнікла ў Маскоўскім раёне, дзе на месцы яблыневага саду запланавалі паставіць забаўляльны цэнтр.**

СТАР. 4



Гасцёўня

**Ірына БАРАНОЎСКАЯ:**

# «ДЗЕЦІ ПАЙШЛІ ЗА МНОЙ»

### Вучаніца Рэнальда Кныша, настаўніца Вольгі Уласавай, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта аб сваім прызванні быць трэнерам



**У студзені старшы трэнер-выкладчык аддзялення скачкоў на батуце Гродзенскай СДЮШАР № 3 Ірына Бараноўская стала лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта «Беларускі спартыўны Алімп». Настаўнік трэніруе батутыстаў ужо каля 30 гадоў. Яна пачынала сваю дзейнасць са спартыўнай гімнастыкі, але потым разам са шматлікімі дзецьмі перайшла ў батут. Адна з першых вучаніц Ірыны Робертаўны — Вольга Уласава, цяпер настаўнік алімпійскага чэмпіёна Уладзіслава Ганчарова. А сама Ірына Бараноўская ў дзяцінстве трэніравалася з яшчэ больш вядомым трэнерам — Рэнальдам Кнышам, у адной зале з алімпійскай чэмпіёнкай Вольгай Корбут. Аб адносінах з вялікімі ў свеце спорту, сакрэтах трэнерскага майстэрства і першых эмоцыях пасля ўручэння прэміі Ірына Робертаўна расказала ў інтэрв'ю нашай газеце.**

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X

# БЕЛАРУСКАЯ ПТУШКА ЗАВАЁЎВАЕ КІТАЙСКІ РЫНАК

**Беларускі экспарт сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання летась узрос на 5,3 % у параўнанні з 2017 годам і склаў 5235 мільёнаў долараў ЗША.**

Мінулы год быў удалым для вытворцаў мясных прадуктаў (цэны былі вышэйшымі за пазалеташнія) і больш складаным для «малочнікаў». Але, як паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Аляксей БАГДАНАЎ**, гэта не перашкодзіла мясной і малочнай прадукцыі прынесці краіне больш за тры мільярды долараў.

Галоўным спажыўцом застаецца наша ўсходняя суседка: у 2018 годзе ў Расію пастаўлена 79 % беларускіх сыравіны і прадуктаў, што ўсё ж на 6,3 % менш, чым у папярэднім.

Аграпрамысловы комплекс дыверсіфікуе экспарт, захоўвае стратэгічныя пазіцыі і набывае новых прыхільнікаў. «Беларускае», а значыць, «якаснае». Гэты факт пацверджаны чэргамі ў замежных крамах і пустымі складамі ў Беларусі, але ён жа дадае і адказнасці прамыслоўцам.

Летась беларускія аграрыі гандлявалі на рынках 95 краін свету. Заклік «Купляйце беларускае!» дарэчны нават у Кітаі. Сёння 51 малочнае прадпрыемства, два мясакамбінаты і пяць птушкафабрык маюць сертыфікаты на экспарт у КНР.

Аляксей Багданаў падкрэсліў, што гэта заслуга кіраўніцтва краіны, вытворцаў і перапрацоўшчыкаў, а таксама эканамічных кірункаў абедзвюх краін. Бо ў той час, як Беларусь зацікаўлена ў пашырэнні экспарту, Кітай імкнецца да пашырэння імпарту.

Пастаўкі ў Кітай у 2018 годзе павялічыліся ў 4,4 раза і склалі 82,4 мільёна долараў ЗША. «Малочных» у гэтай суме — 60,5 мільёна (186,5 тысячы тон). Такім чынам, экспарт малочнай прадукцыі ў грашовым выражэнні ўзрос у дзевяць разоў, а ў натуральным — у 13. Сярод дасягненняў мінулага года Аляксей Багданаў назваў і старт паставак мяса птушкі. Стратэгічная задача — сертыфікацыя на права паставак субпрадуктаў, якія карыстаюцца поспехам у Кітаі.

У краіны Афрыкі пастаўлена прадукцыі ў пяць разоў больш (8,7 мільёна долараў), дзвюх Амерык — на 48 % (9,1 мільёна). Асноўныя спажыўцы — ЗША і Венесуэла. Усяго экспарт у краіны далёкага замежжа ў мінулым годзе ўзрос на 66,7 % і склаў 519 мільёнаў долараў, у краіны Азіі і Акеаніі — у 2,2 раза (151,4 мільёна долараў).

Здаецца, прасцей і зручней арыентавацца на еўрапейскі рынак, але, калі мытная пошліна, напрыклад, на малочную прадукцыю, складае 50 %, зручнасць гэта неапраўданая. Разам з тым экспарт у краіны ЕС летась узрос на 66,6 % і склаў 233,5 мільёна долараў ЗША.

Беларусь мае намер наладзіць яшчэ больш сур'ёзнае супрацоўніцтва з краінамі СНД, Азіі і Акеаніі, Персідскага заліва, Афрыкі, ЕС і Амерыкі.

У міністэрстве сёлета ставяць мэту павялічыць экспарт да 5,7 мільярда долараў ЗША. У прыватнасці, на расійскі рынак плануецца паставіць 3710 тысяч тон малака і малочнай прадукцыі, 320 тысяч тон мяса і мясной прадукцыі.

Да таго ж Беларусь настойліва прапануе пазбавіцца ад прадукцыі з заменнікамі малочнага тлушчу ва ўзаемным гандлі Саюзнай дзяржавы. Наяўнасць «пальмавага» тлушчу ці сапраўднага — гэта пытанне даверу, а на ім заснаваны выбар пакупнікоў. Малако павінна быць «сумленным», упэўнены Аляксей Багданаў.

Акцэнт у АПК робіцца не толькі на павелічэнні аб'ёмаў, але і на вытворчасці тавараў з максімальнай дабаўленай вартасцю. Як паведаміў Аляксей Багданаў, пакуль што надвор'е дазваляе спадзявацца на добры ўраджай, а значыць, і на лепшую кармавую базу. І калі ўсё пойдзе па плане, Беларусь здолее павялічыць прысутнасць на рынках і бліжніх суседзяў, і далёкіх сяброў.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Міжнародны вектар

# Які ён, крытэрый дастатковасці?

**МЗС расчаравана рашэннем нарады Канвенцыі Эспа адносна БелАЭС**

**«Мы глыбока расчараваны рашэннем жэнеўскай нарады бакоў Канвенцыі Эспа аб тым, што беларускі бок нібыта не даў грамадскасці «дастатковай» інфармацыі ў падтрымку абгрунтавання выбару астравецкай пляцоўкі для будаўніцтва БелАЭС», — каментуе сітуацыю прэс-служба Міністэрства замежных спраў.**

Рашэнне было прынята па ініцыятыве дэлегацыі Еўрапейскага саюза, дагаджаючы Літве. «Відавочна, што вынік галасавання быў загадзя вызначаны «блокавай дысцыплінай» краін ЕС, якія складаюць большасць членаў Канвенцыі», — адзначае ў афіцыйным каментары знешнепалітычнае ведамства Беларусі.

Профільны камітэт Канвенцыі нават не растлумачыў, наколькі недастатковай была інфармацыя. Пры гэтым крытэрыяў дастатковасці няма як у самой Канвенцыі, так і ў дакументах, якія вызначаюць правілы работы камітэта па яе выкарыстанні.

Заключэнне Канвенцыі Эспа ніякім чынам не датычыцца пытанняў бяспекі БелАЭС. Гэтая тэма знаходзіцца па-за мандатам дадзенай супольнасці.

Нарада бакоў Канвенцыі аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў трансгранічным кантэксце (Канвенцыя Эспа) праходзіла з 5 да 7 лютага ў Жэневе. Удзел у ёй прымала дэлегацыя Беларусі на чале з першым намеснікам міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Іяй Малкінай.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Супрацоўніцтва

# ЦІ ЗАЦВІЦЕ САКУРА Ў БЕЛАРУСІ?

## У Мінск прыбудзе Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Японіі

**Цяпер дыпламатычная місія гэтай краіны прадстаўлена ў Беларусі часовым паверaным. Чакаецца, што падзея надасць новае дыханне ўзаемадзеянню дзвюх краін. Тым больш, развівацца ёсць куды. Кропак для росту досыць — гэта культура, мастацтва, турызм. Асабліва перспектыўнымі падчас сустрэчы з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры дыпламат Хіракі ТАКУНАГА назваў эканоміку, бізнес, сферу IT і высокіх тэхналогій.**

### Ад аўтазапчастак да трансплантalogіі

Тавараабарот дзвюх краін летась склаў 49 мільёнаў долараў. Японія пастаўляе ў Беларусь у асноўным абсталяванне — аўтамабільныя запчасткі, шыны, аптавалакно. Асноўныя складнікі беларускага экспарту — калійныя ўгнаенні, медыцынскае абсталяванне, алюміній. Але, на жаль, айчынныя тавары амаль невядомыя ў Японіі.

— Мне б хацелася, каб Беларусь скарысталася магчымасцю прадставіць для Японіі і іншых азіяцкіх краін свае тавары і паслугі на сусветнай выстаўцы «Экспа-2025», — адзначыў Хіракі Такунага, паведаміўшы, што форум пройдзе ў горадзе Осака.

Цікавымі з'яўляюцца і інвестыцыйныя праекты. Пасол упэўнены: калі японскія бізнесмены на ўласныя вочы ўбачаць Беларусь, яны скарыстаюцца магчымасцю рэалізоўваць сумесныя праекты. Інтарэс для японскіх прадпрымальнікаў уяўляюць кампанія БелАЗ і Беларускі металургічны завод.

Хіракі Такунага звярнуў увагу, што ў Японіі вядомы высокі ўзровень беларускай медыцыны. Некаторыя японцы звяртаюцца ў нашы медцэнтры па дапамогу, напрыклад, для трансплантацыі печані.

Супрацоўнічае Японія з Беларуссю па праграме «Карані травы», асноўная мэта якой — дапамога людзям, пацярпелым ад аварыі на ЧАЭС. У асноўным, праекты ў рамках гэтай праграмы датычацца рамонту і закупкі тэхнікі для школ і медыцынскага абсталявання.

### Культура і традыцыі

На будучым тыдні выкладчык Беларускай дзяржаўнай гімназіі-каледжа Клара Малышава будзе ўзнагароджана ордэнам Узыходзячага сонца за значны ўнёсак у выхаванне японскіх артыстаў балета. Гэта адзін з самых старажытных ордэнаў Японіі. На працягу многіх гадоў Клара Малышава курыравала адукацыю японскіх студэнтаў, сярод якіх былі будучыя прафесіянальныя артысты балета, кіраўнікі студый. Сёння студэнты харэаграфічнай гімназіі складаюць больш за 10 % ад агульнай колькасці японскіх грамадзян, якія пражываюць у Беларусі.

Сёлета Японію чакае значная культурная падзея — узыходжанне на прастол новага імператара. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запрошаны на святочную цырымонію.

### Як зацікавіць турыстаў?

Па словах спецыялістаў, асаблівы паказчык высокага ўзроўню турыстычнай сферы любой краіны — наяўнасць там японскіх вандроўнікаў.

Павышэнню колькасці ўзаемных візітаў паспрыяла спрашчэнне атрымання японскай візы і бязвізавы рэжым у Беларусі. Па звестках на 2017 год, нашу краіну наведала больш за 620 японцаў.

— Я стараюся прыкладаць намаганні (для папулярызацыі Беларусі. — ***Аўт.***) са свайго боку. Важна, каб беларускія дыпламаты, прадстаўнікі бізнесу і студэнты па абмену таксама прыцягвалі ўвагу японцаў да прыгажосці сваёй краіны, — сказаў пасол. — Пры гэтым Беларусі неабходна ўзмацніць турыстычную інфраструктуру ў такіх момантах як транспартныя паслугі і пражыванне ў рэгіёнах. Таксама японскім турыстам было б зручней, калі б больш выкарыстоўвалася англійская мова.

Звязваюць Беларусь і Японію важныя спартыўныя падзеі. На Еўрапейскіх гульнях у Мінску ў некаторых відах спорту будуць разыграны пуцёўкі на Алімпіяду ў Токіа ў 2020 годзе. Цяпер сталіца Японіі актыўна рыхтуецца да галоўнай спартыўнай падзеі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### СМІ: Токіа не будзе адказваць на пытанне, ці з'яўляецца поўдзень Курыл спрадвечнымі землямі Японіі



Урад Японіі будзе ўстрымлівацца ад адказу на пытанне аб тым, ці з'яўляецца паўднёвая частка Курыльскіх астравоў спрадвечнай тэрыторыяй краіны, каб не пашкодзіць перагаворам з Расіяй аб мірным дагаворы. Як паведамляе тэлеканал NHK, пра гэта гаворыцца ў афіцыйным дакуменце, зацверджаным у пятніцу на пасяджэнні кабінета міністраў.

Ён падрыхтаваны ў адказ на пісьмовы запыт незалежнага дэпутата верхняй палаты парламента Хіраюкі Канісі, які пацікавіўся стаўленнем урада да тэрміна «спрадвечныя тэрыторыі» ў дачыненні да астравоў паўднёвай часткі Курыл.

«Урад, — гаворыцца ў адказе, — мае намер устрымлівацца ад адказу на пытанне, ці з'яўляюцца чатыры паўночныя астравы (так у Японіі называюць паўднёвую частку Курыл. — ***заўв. Рэд.***) спрадвечнымі тэрыторыямі Японіі, паколькі ёсць небяспека, што гэта створыць перашкоды для правядзення перагавораў з Расіяй».

### Паліцыя Украіны адкрыла крымінальную справу аб подкупе выбаршчыкаў штабам Парашэнкі

Гэта адбылося пасля таго, як лідар партыі «Бацькаўшчына» і кандыдат у прэзідэнты Юлія Цімашэнка абвінаваціла ў гэтым перадвыбарчы штаб дзеючага кіраўніка дзяржавы Пятра Парашэнкі, паведаміў кіраўнік МУС Арсен Авакаў.

Паводле яго слоў, нацпаліцыя чакае тлумачэнняў ад Артура Герасімава, кіраўніка фракцыі «Блок Пятра Парашэнкі» ў Вярхоўнай Радзе.

4 лютага Цімашэнка заявіла, што дзеючы прэзідэнт «стварае сетку подкупу і раздае па адной тысячы грыўняў за голас». Тады яна звярнулася да кіраўніка МУС і генеральнага пракурора Украіны і папрасіла іх не дапусціць масавых фальсіфікацый і подкупу выбаршчыкаў.

Усяго на цяперашні момант адкрыта 19 крымінальных спраў аб парушэннях падчас перадвыбарнай кампаніі, дадаў Авакаў.

Паводле яго слоў, паліцыя мае намер фіксаваць парушэнні, называць іх і перадаваць у Цэнтрвыбаркам, дзе могуць выносіць санкцыі — папярэджваць, здымаць кандыдата і г. д. Усяго дакументы на рэгістрацыю здаў 91 прэтэндэнт, 42 з іх на вечар чацвярга атрымалі «дабро» ад ЦВК, паведамляе ТАСС.

Выбары ва Украіне пройдуць 31 сакавіка.

### Індыец вырашыў судзіцца з бацькамі. Яны нарадзілі яго, не атрымаўшы яго згоды

27-гадовы індыец збіраецца падаць судовы іск супраць уласных бацькоў за тое, што яны нарадзілі яго, не атрымаўшы яго згоды. Бізнесмен з Мумбаі Рафаэль Самуэль кажа, што лічыць несумленным той факт, што дзеці з'яўляюцца на свет супраць сваёй волі і вымушаныя пераносіць пакуты на працягу ўсяго жыцця.

Ён выдатна разумее, што спытаць аб згодзе будучага дзіцяці на яго нараджэнне да яго з'яўлення на свет немагчыма. Аднак яго цікавіць менавіта тое, што чалавек з'яўляецца на свет супраць сваёй волі. Індыец упэўнены, што чалавек павінен пажыццёва атрымліваць кампенсацыю за тое, што ён нарадзіўся, хоць не прасіў пра гэта.

Самуэль сцвярджае, што ў яго цудоўныя адносіны з бацькамі (яны абодва — юрысты), яны выдатна ладзяць. Бацькі ставяцца да планаў сына падаць іск супраць іх з істотнай доляй гумару. Яго маці, Кавіта Карнад Самуэль, назвала тое, што адбываецца, яшчэ адным новым бунтам, які зладзіў яе сын.

«Калі Рафаэль здолее прадставіць рацыянальнае тлумачэнне таго, якім чынам мы маглі б даведацца да яго нараджэння аб яго згодзе ці нязгодзе з'явіцца на свет, то мы прызнаем сваё паражэнне», — кажа Кавіта Самуэль.

Культасвета

# Стаўка на духоўнасць

**Ролю кнігі ў фарміраванні культуралагічнага, духоўна-маральнага складніка развіцця грамадства абмеркавалі ўдзельнікі круглага стала, што прайшоў у сталічным храме-помніку ў гонар Усіх Святых у межах XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Думкамі, развагамі і прапановамі наконт папулярызацыі чытання, важнасці кнігі як неад'емнай часткі адукацыі і выхавання новага пакалення абмяняліся прадстаўнікі дзяржаўных ведамстваў, праваслаўнай і каталіцкай канфесій, вядучыя кнігавыдаўцы, даследчыкі мовы і літаратуры, сучасныя пісьменнікі.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Як падкрэсліў **мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх Усяе Беларусі**, гэта сустрэча — важная падзея не толькі для творчых людзей, яна мае дзяржаўную значнасць: «Хацелася б, каб незалежна ад развіцця тэлебачання і інтэрнэту, з'яўлення новых тэхналогій кніга засталася з намі назаўжды. Бо менавіта кніга дае нам магчымасць творча і крытычна разважаць аб жыцці чалавека, аб тым, хто мы ёсць на зямлі і што адбываецца вакол нас, задумацца пра мінулае, цяперашні час і, вядома, будучыню».

...Ці патрэбная сёння кніга ў яе традыцыйным фармаце, ці варта ацэньваць каштоўнасць літаратуры катэгорыямі «падабаецца / не падабаецца» або нейкімі іншымі крытэрыямі, і на што мусяць рабіць упор сучасныя аўтары — на мараль і духоўнасць альбо толькі на забаву чытача? Толькі адказаўшы на гэтыя пытанні, можна выпрацаваць агульную стратэгію развіцця ўсёй кнігавыдавецкай галіны, падкрэсліў **намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ.** Ён, дарэчы, расказаў, што падчас выстаўкі ў ведамстве робяць своеасаблівы зрэз чытацкай цікавасці — просяць актыўных чытачоў, а таксама выдаўцоў, прадстаўнікоў дзяржаўных устаноў і саміх літаратараў скласці спіс кніг, вартых увагі і прачытання. У доўгатэрміновай перспектыве Мінінфармацыі планує стварыць паводле гэтага маштабнага апытання адмысловую бібліятэку з рэкамендаваных кніг, магчыма, у аўдыяфармаце.

Нягледзячы на шматбаковасць і разнастайнасць сучаснай літаратуры, часта ў кнігарнях на самым бачным месцы, на першых паліцах стаяць творы, якія карыстаюцца ў пакупнікоў папулярнасцю, але іх змястоўная і духоўная каштоўнасць выклікаюць пытанні, заўважыў падчас дыскусіі **епіскап Юрый КАСАБУЦКІ.** На яго думку, добрая кніга сапраўды фарміруе асобу, але каб чалавек меў магчымасць знайсці і выбраць сапраўды добрыя кнігі, трэба не абмяжоўвацца толькі хрэстаматыямі ды спісам неабходнай літаратуры для школьнай праграмы, але дапамагаць сарыентавацца і дарослым, што варта пачытаць: «Чаму б не зрабіць пры падтрымцы дзяржавы такі сацыяльны праект у СМІ, як рэклама добрай кнігі — гістарычнай, навуковай, мастацкай і г. д.?»

«Без кніг мы не вырасцім вучоных багасловаў, філосафаў і экспертаў. Вось чаму нашы дзеці павінны абавязкова чытаць «Вайну і мір», «Злачынства і пакаранне», пісаць у школе сачыненні і вучыцца разважаць, крытычна мысліць, адрозніваць добрае ад дрэннага», — адзначыў **настаяцель Усіхсвяцкага прыходу протаіерэй Фёдар ПОЎНЫ.**

Удзельнікі мерапрыемства абмеркавалі найважнейшыя задачы, што мусяць ставіць перад сабой сучасныя пісьменнікі, пагаварылі аб тым, як стымуляваць любоў да чытання ў дзяцей і як скласці ідэальны падручнік па літаратуры, прыйшоўшы да высновы, што падобныя сустрэчы варта рабіць больш шырокімі — магчыма, з удзелам бацькоў і педагогаў, а магчыма, у выглядзе тэлевізійных дыскусій папулярных аўтараў з дзецьмі і падлеткамі.

Акрамя таго, былі прэзентаваныя некалькі кніг: адмысловае выданне «Евангелля», а таксама прадстаўленыя ў серыі «Жыццё знакамітых людзей» біяграфічныя кнігі «Патрыярх Кірыл» і «Ісус Хрыстос» мітрапаліта Валакаламскага Іларыёна і «Айцец Іаан (Крэсцьянкін)» Вячаслава Бандарэнкі.

Больш падрабязна пра тэмы і прапановы, якія былі агучаны ў ходзе круглага стала, «Звязда» раскажа ў аўторак, падводзячы вынікі XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# МІРСКІ ЗАМАК СТАНЕ БОЛЬШ ПРЫВАБНЫМ ДЛЯ ТУРЫСТАЎ

## Аўдыягіды, адноўлены італьянскі парк і летняя кавярня

**Нягледзячы на тое, што грунтоўная рэканструкцыя старажытнага замка завершана, у ім працягваюцца работы па аднаўленні наваколля і ўнутраным аснашчэнні.**



Так, адным з этапаў па далейшым удасканаленні палацавага комплексу «Мір» стане атрыманне 126 тысяч еўра на тэхнічнае аснашчэнне яго экспазіцый. Сродкі выдзяляюцца па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва «Літва — Латвія — Беларусь 2014—2020» у рамках рэалізацыі сумеснага праекта з Дырэкцыяй літоўскіх паркаў Павільню і Веркю.

Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміў **дырэктар музея «Палацавы комплекс «Мір» Алесь ЛОЙКА.** Паводле яго слоў, на гэтым тыдні адбылося падпісанне партнёрскага дагавора паміж музеем у Міры і дырэкцыяй літоўскіх рэгіянальных паркаў па рэалізацыі сумеснага праекта. Аб'ядноўваюць бакі ўладальнікі замка, якія былі трэцімі па ліку — князі Вітгенштэйны. На рэалізацыю праекта па тэхнічным умацаванні (што ўключае набыццё сучасных сродкаў для візуалізацыі і аўдыялізацыі дзеючай экспазіцыі) беларускаму боку, як пераможцу праекта, выдзеляць грант у 126 тысяч еўра. Па словах суразмоўніка, сёлета ўсе работы будуць завершаны.

**Наша даведка**

**У 2000 годзе ЮНЕСКА ўключыла Мірскі замак у Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны.**

Другім этапам сумеснага партнёрства з літоўскім бокам павінен стаць узвел зноў жа ў трансгранічным праекце па рэканструкцыі італьянскага рэнесанснага парку, які існаваў пры Радзівілах.

— Мы выходзім за межы замка і звяртаем сваю ўвагу на навакольныя краявіды: палацавы комплекс размешчаны на тэрыторыі 26 гектараў, — тлумачыць Алесь Лойка выбар далейшых шляхоў да таго, каб зрабіць наведванне адной са славутых мясцін Беларусі больш прывабным для турыстаў. Цяпер «Мінскпраект» рыхтуе праектна-каштарысную дакументацыю. Работы па рэканструкцыі плануюць распачаць налета.

Адным з дадатковых прывабных момантаў павінна стаць і летняя кавярня, якая з'явіцца тут пасля рэканструкцыі дамбы менавіта пад гэтыя патрэбы.

Дарэчы, праектная арганізацыя «Гроднаграмадзянпраект» ужо распрацоўвае праектна-каштарысную дакументацыю, згодна з інвестпраектам, заключаным паміж Гродзенскім аблвыканкамам і музеем «Палацавы комплекс «Мір».

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# СТАРТУЕ «МІНСКАЯ ЛЫЖНЯ — 2019»

**Спартыўнае свята пройдзе на лыжаролернай трасе ў Вяснянцы 9 лютага, пачнецца ў 10:00 і працягнецца да 16:30, паведамілі «Звяздзе» ў Міністэрстве спорту і турызму.**

**Такім чынам, праграма свята прадугледжвае:**

да 10:00 — прыбыццё ўдзельнікаў. Рэгістрацыя і атрыманне нумароў будзе ажыццяўляцца ў Футбольным манежы.

11:00 — біятлонная эстафетная гонка 4 па 3,6 км сярод камандаў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, Вярхоўнага Суда, Канстытуцыйнага Суда, Нацыянальнага алімпійскага камітэта, камандаў аматараў.

11:40 — біятлонная гонка з масавым стартам сярод жанчын на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

12:20 — біятлонная эстафетная гонка 4 па 3,6 км з удзелам камандаў цэнтральных апаратаў сілавых міністэрстваў і ведамстваў, іх структурных падраздзяленняў.

13:00 — лыжная эстафетная гонка 4 па 1,2 км з удзелам камандаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання (міністэрствы і ведамствы з колькасцю апарату 100 чалавек і вышэйшай).

13:40 — лыжная эстафетная гонка 4 па 1,2 км з удзелам камандаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання (міністэрствы і ведамствы з колькасцю апарату да 100 чалавек).

14:20 — лыжная эстафетная гонка 4 па 2,5 км з удзелам камандаў вышэйшых навучальных устаноў (з ліку студэнтаў).

14:50—16:30 — масавыя старты ў лыжных гонках на 2,5 км.

Падчас біятлоннай эстафетнай гонкі кожны ўдзельнік пройдзе дыстанцыю 3,6 км (тры кругі па 1,2 км) з двума агнявымі рубяжамі. Стральба (пяць стрэлаў без дадатковых патронаў) будзе арганізавана з адлегласці 45 м са становішча лежачы з малакаліберный вінтоўкі па біятлонных мішэнях дыяметрам 11,5 см. За кожную незакрытую мішэнь удзельніку будзе прызначаны адзін штрафны круг (50 м). Вінтоўкі будуць размяшчацца на пазіцыях для стральбы, а стральба весціся пад наглядам інструктара.

Пераможцы і прызёры ў эстафетах вызначаюцца па найменшым часе, затрачаным на праходжанне дыстанцыі чатырма ўдзельнікамі. Найлепшых узнагародзяць медалямі і прызамі, каманды-пераможцы і прызёры атрымаюць кубкі. Усе ўдзельнікі, якія прыйшлі да фінішу, атрымаюць па памятным медалі.

Балельшчыкаў таксама чакае культурна-забаўляльная праграма.

# МІНСКІ СТАДЫЁН СЯРОД НАЙЛЕПШЫХ У СВЕЦЕ

**Рэканструяваны «Дынама» ўвайшоў у спіс намінантаў на званне «Стадыён 2018 года». Такая інфармацыя размешчана на сайце stadiumdb.com.**



Акрамя дынамаўскага, на званне найлепшага стадыёна планеты 2018 года прэтэндуюць яшчэ 26 арэн з ЗША, Аўстраліі, Аўстрыі, Італіі, Венгрыі, Турцыі, Ірана, Ірака і Кітая. Пераможца будзе вызначаны пасля выбару прафесійнага журы архітэктараў, а таксама адкрытага галасавання балельшчыкаў, якое завершыцца 3 сакавіка на сайце stadiumdb.com. Вынікі будуць абвешчаны 7—8 сакавіка. Адзначым, што ў 2015 годзе на гэтую ўзнагароду прэтэндавала «Барысаў-Арэна», яна заняла 7-е месца.

Нагадаем, стадыён «Дынама» быў пабудаваны ў 1934 годзе, пасля чаго некалькі разоў рэканструяваўся. Цяпер яго трыбуны змяшчаюць 22 246 гледачоў. Арэна можа прымаць самыя прэстыжныя міжнародныя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы і футболе. У чэрвені мінскі стадыён «Дынама» прыме цырымоніі адкрыцця і закрыцця, а таксама лёгкаатлетычны турнір II Еўрапейскіх гульняў 2019 года.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# Эвакуявалі з інтэрната 1141 чалавека

**За некалькі хвілін да апоўначы сталічным ратавальнікам ад жыхароў паступіла паведамленне аб задымленні ў 13-павярховым будынку інтэрната на праспекце Машэрава.**

Калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, гарэння па знешніх прыкметах не назіралася. У ходзе разведкі высветлілася, што на першым паверсе адбылося загаранне пластыкавага смеццевага кантэйнера і адкладаў смецця ў шахце смеццеправода. Плошча гарэння склала два квадратныя метры.

Ратавальнікі сумесна з адміністрацыяй аб'екта эвакуявалі з інтэрната 1141 чалавека (з іх 48 — да 18 гадоў і 341 замежнага грамадзяніна), паведамілі ў МНС. Пасля ліквідацыі пажару па медыцынскую дапамогу звярнуліся тры студэнты, якія адчулі сябе дрэнна. З папярэднімі дыягназамі «атручэнне прадуктамі гарэння» іх даставілі ў бальніцу.

Пажар быў лакалізаваны і ліквідаваны падраздзяленнямі МНС у 0.06. Яго прычына ўстанаўліваецца, адна з версій — неасцярожнае абыходжанне з агнём.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЯБЛЫНІ РАЗЛАДУ

## «ЛЁГКІЯ» РАЁНА

Мясцовыя расказваюць, што сад быў закладзены яшчэ да Першай сусветнай вайны, а апошнія яблыні саджалі студэнты ў 1975 годзе.

— Я тут з 1980-х жыву. Чаму і душа баліць: мы выраслі разам з гэтымі яблынямі! — не можа застацца абыякавай да сітуацыі **жыхарка раёна Алена ІВАНЮК.** — Літаральна сто метраў ад дарогі, а трапляеш быццам у іншы свет. Улетку тут усё квітнее, птушкі заліваюцца — такое адчуванне, быццам ты, гарадскі жыхар, прыехаў у нейкі санаторый. Бачыце, вунь кармушкі і лавачкі? Іх Генадзь Рыгоравіч робіць — мясцовы актывіст, 71 год, ваенны адстаўнік.

— Дрэвы багата пладаносяць, сюды прыязджаюць па яблыкі з усяго горада, — дадае **суседка Ірына СОКАЛ**. — Сад, па сутнасці, стаў візітнай карткай раёна: многія куплялі кватэры менавіта з-за яго. Тут нават прыпынак адпаведна названы. Па сцежках пастаянна бегаюць вожыкі, зайцы, пераялёткі ўзлятаюць.

Пакуль мы шпацыруем з жанчынамі па садзе, раз-пораз сустракаем лыжнікаў, дзяцей з бацькамі, што выбраліся пакатацца на санках.

— Школьнікі часта ходзяць сюды на ўрокі фізкультуры, — заўважае Ірына. — Раней казалі, што гэта зялёная зона — «лёгкія» раёна. Там далей ужо відаць кальцавая дарога. Таму астравок прыроды павінен застацца, каб горад дыхаў.



### Лічбы

Падчас адной з прамых ліній мэр сталіцы Анатоль Сівак заявіў, што трэба высвятліць запатрабаванасць новых гандлёва-забаўляльных цэнтраў. Бо ў некаторых з тых, што ўжо ёсць, пустуюць плошчы. Па інфармацыі галоўнага статыстычнага ўпраўлення Мінска, на 1 кастрычніка 2018 года ў горадзе працавала 98 гандлёвых аб'ектаў. Іх узровень фактычнага выкарыстання складаў 81,9 працэнта.

Згодна з горадабудаўнічым планам, на месцы саду запланавалі паставіць шматфункцыянальны культурна-відовішчны цэнтр з паркоўкай. А яшчэ зрабіць ландшафтна-прагулачную зону са сцежкай здароўя, веладарожкі, гімнастычны гарадок, пляцоўкі для гульняў, пункт пракату, гарадок казак з атракцыёнамі, зону катання адпачынку «Маленькая Венецыя» і многае іншае.

Мясцовым жыхарам план падаўся сумнеўным: столькі аб'ектаў папросту не памесціцца на гэтым участку зямлі — пабудуюць у выніку толькі забаўляльны цэнтр, а астатнюю праграму згорнуць. І амаль не пакінуць дрэў, хоць у экалагічным дакладзе па ацэнцы будаўнічага праекта стан насаджэнняў ацэньваецца як здаровы. У Маскоўскім раёне, трэба сказаць, і так праблема з азеляненнем: на аднаго жыхара там прыпадае 3,5 квадратнага метра азеляненых тэрыторый агульнага карыстання, хоць норма складае 8—10 «квадратаў».

Што да інфраструктуры, то непадалёк ёсць забаўляльны цэнтр, начны клуб, піцэрыі, спартыўны комплекс. «Тут забаў столькі, што ў нас няма ні часу, ні грошай наведаць іх усе», — усміхаецца Алена.

Наконт неабходнасці асфальтаваных дарожак у садзе ў многіх таксама ёсць пытанні.

— Сцежкі тут грунтавыя, лясныя. Не трэба класці асфальт — тым больш ландшафт няроўны, давядзецца палову саду выкарчаваць. А добраўпарадкаваныя дарожкі ёсць у парку Паўлава, ён блізка. Але пенсіянеры адтуль прыходзяць гуляць сюды. Мы хочам захаваць менавіта такі фармат адпачынку, — дзеляцца мясцовыя. — Калі інвестар хоча ўкласці грошы, дык няхай укладзе іх у тыя землі, дзе нічога не расце. У нас жа хапае ўчасткаў, якія пустуюць. Каля гіпермаркета «Гіпа», напрыклад.

На грамадскіх абмеркаваннях жыхары прасілі: не трэба нам таго відовішчнага цэнтра і іншых паркавых аб'ектаў. Лепш проста пастаўце новыя лавачкі і альтанкі ды захавайце тэрыторыю ў натуральным выглядзе. Пад калектыўнымі заўвагамі і прапановамі падпісалася больш за 870 чалавек.

Пра экалогію ў раёне непакояцца яшчэ і таму, што адразу за садам плануецца будаўніцтва дарогі.

### Афіцыйна

У снежні на нарадзе з актывам Мінска Аляксандр Лукашэнка даручаў прыкласці дадатковыя намаганні па стварэнні камфортнага асяроддзя ў сталіцы. Ён адзначаў, што далейшае развіццё горада павінна ісці перш за ўсё за кошт рэканструкцыі тэрыторый, якія існуюць, а не новага будаўніцтва. Напрыклад, можна больш эфектыўна выкарыстоўваць плошчы, занятыя вытворчымі аб'ектамі.

«Пасягаць на зялёныя насаджэнні нават і не думайце, — казаў тады кіраўнік краіны. — Майце на ўвазе, што спецыяльна група маніторыць інтэрнэт і глядзіць, як па краіне начальнікі і кіраўніцтва абыходзяцца з дрэвамі, паркамі і скверамі. Аб гэтым адразу ж пісьмова інфармуецца Прэзідэнт. І мы разбіраемся з кожным гэтым выпадкам. Перш чым секчы, падумайце, колькі дрэў вы пасадзілі. Гэта ж здароўе. Падумайце пра дзяцей».

Ён таксама патрабаваў выключыць практыку, калі забудоўшчыку дазваляюць адкарэктаваць праект і не будаваць паркінгі, аб'екты сацыяльнага прызначэння і не займацца добраўпарадкаваннем.

— Лясочак з боку Сухарава падсеклі капітальна летась. Спачатку там будавалі дарогу — працяг вуліцы Маршала Лосіка. Згодны, гэта дарога гораду патрэбна, яна прасілася. Але навошта яшчэ адна? Тым больш у горадабудаўнічым праекце напісана, што важна захаваць каштоўнае балота Сухарава, якое якраз там знаходзіцца, — звяртаюць увагу мясцовыя на супярэчнасці.

## УЛАДЫ ГАТОВЫ ПРЫСЛУХАЦЦА

У камітэце архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама пацвярджаюць: быў распрацаваны дэталёвы план рэканструкцыі і ўладкавання нядобраўпарадкаваных азеляненых тэрыторый у раёне вуліц Гарэцкага і Рафіева. Там меркавалася пабудаваць пляцоўкі для гульняў і адпачынку, альтанкі, пешаходныя і веладарожкі, малыя архітэктурныя формы. А шматфункцыянальны культурна-відовішчны цэнтр задумваўся для жыхароў прылеглых буйных раёнаў — Паўднёвага Захаду, Малінаўкі, Сухарава.

На пытанне, ці вывучалася, як гэта ўсё адаб'ецца на экалогіі, падрабязнай інфармацыі атрымаць не ўдалося. «Распрацаваны комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на захаванне і ахову найбольш каштоўных раслінных комплексаў, а таксама на павышэнне рэкрэацыйных магчымасцяў і эстэтычных характарыстык тэрыторый», — толькі сказана ў атрыманым газетай адказе за подпісам **намесніка старшыні камітэта Вольгі ВЕРАМЕЙ.**

Будаўніцтва дарогі за садам — праектаванай вуліцы № 11 (працяг Мачульскага) — тлумачаць тым, што трэба забяспечыць дадатковую сувязь мікрараёнаў Сухарава і Малінаўка. «Для трасіроўкі вуліцы вылучаны ўчастак, на якім адсутнічаюць зялёныя насаджэнні. Дадзенае праектнае рашэнне прынята ў адпаведнасці з генеральным планам Мінска», — зазначаюць у камітэце.

Але да мясцовых жыхароў гатовы прыслухацца. Па выніках грамадскага абмеркавання будаўніцтва культурна-відовішчнага цэнтра вырашылі выключыць з дэталёвага плана.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**«Антикризисный управляющий ИООО «Сырьевые ресурсы» – ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов) извещает о проведении 13.03.2019 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 93А, оф. 404, открытых торгов по продаже:**

Дебиторской задолженности ИООО «Сырьевые ресурсы»: строительное унитарное предприятие «Строительное управление № 51» (размер задолженности – 9 288,73 BYN) – первоначальная цена 8 359,86 BYN.

Имущества ИООО «Сырьевые ресурсы»: I3 панели для облицовки ванны, отд ST-01 Armenian Travertine polished finish. Не вкл. смесители и др. оборудование – 224,29 руб. В количестве 47 компл., общей стоимостью 10541,63 руб.; ванна из акрила с подконструкцией из вспененного полистирола. Размеры по проекту – 1864,33 руб. в количестве 66 шт., общей стоимостью 123045,75 руб.; Внутренняя часть термостата арт. 3542597090 Dornbracht – 347,87 руб. в количестве 32 шт., общей стоимостью 11131,84 руб.; Держатель для душевой лейки арт. 3508597090 Dornbracht – 47,32 руб. в количестве 43 шт., общей стоимостью 2034,76 руб.; Держатель для туалетной бумаги art.83500979-00 Dornbracht – 144,77 руб. в количестве 1 шт.; Запасной держатель для туалетной бумаги art. 83590979-00 Dornbracht – 93,48 руб. в количестве 2 шт., общей стоимостью 93,48 руб.; Каменный плинтус: размерысогласно проекту, отделка ST-01 Armenian Travertine polished finish – 60,31 руб. в количестве 130,9 погон. м, общей стоимостью 7894,58 руб.; Каменный топ, размеры согласно проекту – 1345,78 руб. в количестве 54 компл., общей стоимостью 72672,12 руб.; Кнопка смыва art. 9.240.626 Tece – 70,99 руб. в количестве 1 шт.; Комплект для ванной art. custom Interiorplus – 1281,16 руб., в количестве 21 шт., общей стоимостью 26904,36 руб.; Кресло рабочего стола согласно спецификации – 721,98 в количестве 1 шт.; Кресло согласно спецификации – 1202,84 руб. в количестве 1 шт.; Крышка для унитаза арт. 43183 – 20,87 руб. в количестве 1 шт.; Металлическая вставка для порога из нержавеющей стали – 33,36 руб., в количестве 972 пог. м, общей стоимостью 32425,92 руб.; Металлическая конструкция для колонны душевой. Размеры по проекту – 976,35 руб. в количестве 21 шт., общей стоимостью 20503,35 руб.; Направляющие (металлический профиль) для стеклянной перегородки WC, в комплекте с крепежом – 724,86 руб., в количестве 25 компл., общей стоимостью 18121,50 руб.; Направляющие (металлический профиль) для стеклянной перегородки, в комплекте с крепежом – 1171,11 руб., в количестве 146 шт., общей стоимостью 170982,06 руб.; Облицовка душевой колонны. Отделка ST-01 Armenian Travertine polished finish – 1001,17 руб., в количестве 12 компл., общей стоимостью 12014,04 руб.; Облицовка душевой колонны. Отделка ST-01 Armenian Travertine polished finish – 886,22 в количестве 9 компл., общей стоимостью 7975,98 руб.; Облицовка пола мрамором душевой поддон: отделка камень ST-01 Armenian Travertine polished finish – 506,45 руб., в количестве 13 компл., общей стоимостью 6583,85 руб.; Облицовка пола мрамором: р600х600х20mm отделка камень ST-01 Armenian Travertine polished finish – 176,71 руб., в количестве 161,28 кв. м, общей стоимостью 28499,79 руб.; Облицовка стен ST-01 Armenian Travertine polished finish – 176,71 руб., в количестве 190,89 компл., общей стоимостью 33732,17 руб.; Одностворчатая стеклянная дверь WC:отд GL03 laquered glass – 590,66 руб., в количестве 24 шт., общей стоимостью 14175,84 руб.; Полотенцедержатель art. 650 2700 Steinberg – 133,88 в количестве 1 шт.; Прикроватная тумба согласно спецификации – 943,51 руб. в количестве 2 шт., общей стоимостью 1887,02 руб.; Пуф согласно спецификации – 522,17 руб., в количестве 1 шт.; Раковина art. custom made dim 510x310 Interiorplus – 551,11 руб., в количестве 1 шт.; Светильник настенный согласно спецификации – 305,65 руб., в количестве 1 шт.; Светильник настольный согласно спецификации – 196,56 руб., в количестве 1 шт.; Сифон art. SI.2 Alape – 90,77 руб., в количестве 1 шт.; Стеклянная перегородка WC: n1стеклофикс, отд GL03 laquered glass – 469,34 руб., в количестве 24 шт., общей стоимостью 11264,16 руб.; Стеклянная перегородка душевой: 1 стекло фикс + 1 дверь распашная, отд GL2 with leaf effect pattern – 2491,42 руб., в количестве 24 компл., общей стоимостью 59794,08 руб.; Стеклянная перегородка душевой: 1стеклофикс, отд GL03 laquered glass – 685,21 руб., в количестве 24 компл., общей стоимостью 16445,04 руб.; Стеклянная перегородка душевой: 1стекла фикс + 1стекло фиксир, отд GL2 with leaf effect pattern – 1462,02 руб., в количестве 24 компл., общей стоимостью 35088,48 руб.; Топ ванны отделка ST-01 Armenian Travertine polished finish. Не включая смесители и др. оборудование – 523,34 руб., в количестве 41 компл., общей стоимостью 21456,94 руб.; Фурнитура для деревянной раздвижной двери:вкл.подконструкцию раздвижной двери,ручки – 1083,41 руб., в количестве 177 шт., общей стоимостью 191763,57 руб.; Фурнитура стеклянной перегородки wc: вкл. подконст,петли,дв.ручки д/стекл. перегородки – 1350,74 руб., в количестве 48 шт., общей стоимостью 64835,52 руб.

Со списком имущества, выставляемого на торги, можно ознакомится, направив заявку в адрес организатора торгов, по адресу: info@capital-dialog.by.

Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 12.03.2019 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации до 12.03.2019 г. вкл. на р/с ИООО «Сырьевые ресурсы» р/с BY91BPSB30120121400179330000 в белорусских рублях ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, код BPSBBY2X, УНП 100235669.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 5 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Уведомление участников об итогах торгов в день торгов, публично. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее чем за один день до их проведения

**Республиканский благотворительный фонд помощи детям «Подари надежду»**

Количество учредителей Фонда – 2 человека, из них 2 – физические лица.

Единица измерения – тыс. руб.

Информация о стоимости имущества Фонда «Подари надежду» (далее – Фонд):

– остаточная стоимость основных средств на 31.12.2018 г. составляет 24 200 тыс. руб., в том числе:

– автомобиль БМВ 730 Li, 2007 г. в. – 22 900 тыс. руб. (заключение об оценке № 13.12.2018 г. от 13.12.2018 г.).

– земельный участок общей площадью 0,25 га – 1300 тыс. руб. (согласно данных Национального кадастрового агентства).

– поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством – 9,11 тыс. руб.

Общая сумма расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в Уставе Фонда, составляет 11,3 тыс. руб.

В том числе:

а) на выплату заработной платы и прочих социальных выплат сотрудникам – 0,0 тыс. руб.

b) на оплату налогов и прочих обязательных платежей – 0,0 тыс. руб.

c) на уставные и благотворительные цели – 11,3 тыс. руб.

Фонд не является учредителем унитарных предпритий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществлени предпринимательской детельности.

УНП 805003382

Другасныя рэсурсы

# ЯК НАРАДЖАЕЦЦА ШКЛЯНАЯ БУТЭЛЬКА

## Куды ідзе сыравіна з сініх кантэйнераў і пунктаў прыёму

**Прэзідэнт Беларусі прапанаваў паступова адмаўляцца ад пластыкавай упакоўкі і пераходзіць на шкло. Пакуль толькі гэты матэрыял можна перапрацоўваць бясконца. «Звязда» «падглядзела» за працай Гродзенскага шклозавода і даведалася, як са старых бутэлек, што мы выкідаем у сіні кантэйнер альбо здаём у пункты прыёму, робяцца новыя.**

Ці ведалі вы, што кожны з нас сёння прымае ўдзел у стварэнні новай бутэлькі, таму што большая яе частка складаецца са шклабою (60 %) — тых самых бутэлек і слоікаў, якія мы здаём на перапрацоўку. **Начальнік састаўнога цэха шклозавода Міхаіл ПАЎЛЮКЕВІЧ** падкрэслівае: за чатыры гады на прадпрыемстве пачалі выкарыстоўваць амаль у тры разы больш шклабою, яшчэ ў 2014 годзе ў новы прадукт яго дадавалі ўсяго каля 15—25 %.

— Раней мы столькі шкла не збіралі. А вось як пачалі заварваць смеццеправоды, паставілі спецыяльныя кантэйнеры, — вязуць да нас яго і вагонамі, і машынамі з усёй краіны, — адзначыў спецыяліст. — Вельмі шмат прыносяць таксама прыёмныя пункты.

Пра тое, што беларусы сапраўды пачалі лепш сартаваць шкло, гаворыць і ў дзяржаўнай установе «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў». Паводле іх даных, у 2012 годзе было сабрана 59,1 тысячы тон сыравіны, а ў 2017-м ужо 181,3 тысячы тон — на 207 % больш. І з кожным годам лічба расце. Для параўнання: за 2018 год здалі на перапрацоўку ўжо 189,5 тысячы тон, розніца з мінулым годам складае 4,5 %.



Большая частка гэтай прадукцыі зроблена са шклабою.

На прадпрыемстве плануюць дасягнуць еўрапейскіх паказчыкаў і выкарыстоўваць 90 % шклабою. Але пакуль для гэтага на заводзе не хапае тэхнічных магчымасцяў.

— Нам ёсць да чаго імкнуцца, — гаворыць **начальнік участка пракатнага цэха Дзмітрый АМЕЛЬЯНОВІЧ.** — Хоць зрабіць новую бутэльку на сто працэнтаў са шклабою нельга: яна проста не «зварыцца». Абавязкова трэба дадаць шыхту — сумесь з пяску, соды і шчэбню.

Насамрэч, калі прыглядзецца, то выраб шкляной тары не вельмі адрозніваецца ад выпечкі той жа булкі — з-за падобнай паслядоўнасці дзеянняў. Спачатку трэба падрыхтаваць інгрэдыенты — на шклозаводзе ўсе яны захоўваюцца ў састаўным цэху.

— На першым паверсе сыравіна апрацоўваецца: сушыцца і крышыцца. Затым яна прасейваецца на другім паверсе і паступае ў спецыяльныя бункеры, дзе ўсе кампаненты ўзважваюцца, змешваюцца і пасля пры дапамозе загрузчыкаў ідуць у печ, — расказаў Міхаіл Паўлюкевіч. — Працэс аўтаматычны, але ўсё, што адбываецца, кантралюе састаўшчык шыхты.

Пясок для светлых бутэлек прыязджае на Гродзенскі шклозавод з Гомельскай вобласці, для цёмных — з Мікашэвіч і Брэста. Шчэбень прывозяць з Віцебска, а шклабой збіраюць з усёй краіны. Самы дарагі інгрэдыент для прадпрыемства — кальцыніраваная сода. Яе ў Беларусі няма, таму дастаўляюць з Расіі.

— Шклабой мы робім самі. Гэта для нас больш выгадна, чым закупляць



На прадпрыемстве шклабой робяць самі.

гатовы. Памер шкляной крупы не павінен перавышаць 20—25 міліметраў — калі будзе больш ці менш, то заб'юцца рэгенератары, — расказвае спецыяліст. — Таксама мы набылі магнітныя сепаратары, якія прыцягваюць чорныя і каляровыя металы — апошнія здаём на перапрацоўку.

Пасля таго як усе інгрэдыенты перамешваюцца, іх адпраўляюць у печ з тэмпературай 1500 градусаў. Там яны расплаўляюцца ў шкламасу і пераходзяць у кропельны сілкавальнік. Сваю форму будучая бутэлька атрымлівае ў шклофармавальнай машыне пры дапамозе метаду двайнога выдзімання. А трываласць — у печы абпалу, дзе яе паступова ахаладжваюць. На якасць гатовую тару правяраюць інспекцыйнай машынай і візуальным аглядам.

Калі разам са шклянымі бутэлькамі і слоікамі ў сіні кантэйнер для адходаў трапіць, напрыклад, аконнае шкло — новы прадукт можа і не атрымацца. На прадпрыемстве гавораць, што такіх «чужынцаў» дапускаецца не больш за 5 %. І ў асноўным яны адсейваюцца яшчэ на стадыі прыёму. Аднак як толькі лішні інгрэдыент «праскоквае», уся партыя адбракоўваецца. Дарэчы, і такой некандыцыі даюць шанец на другое жыццё: яе выкарыстоўваюць у якасці шклабою для наступнай партыі бутэлек.

На шклозаводзе падкрэсліваюць, што яны «рукамі і нагамі за» ідэю Прэзідэнта пра пераход на шкляную тару. Аднак пакуль беларускія вытворцы могуць пакрыць толькі палову патрэбнасцяў рынку ў шкляной тары.

**Кацярына ЦІТОВА, фота аўтара.**

Прававая гасцёўня

# ПСІХІЯТРЫЧНАЯ ЭКСПЕРТЫЗА І СУД,

## каб вярнуць дзеяздольнасць старому

***Маёй маме 80 гадоў. Доўгі час я жыла за мяжой і мела з ёй мала стасункаў. Нядаўна вярнулася і даведалася, што мой малодшы брат афіцыйна пазбавіў яе дзеяздольнасці і аформіў над маці апякунства. Аднак ён не даглядае яе належным чынам, таму я забрала яе да сябе. Яна ўспрымае мяне адэкватна, абслугоўвае сябе па меры сіл, нармальна гаворыць. Падазраю, што брат нейкім чынам падгаварыў дактароў прызнаць яе недзеяздольнай, каб карыстацца яе грашыма. Хачу вярнуць маці нармальнае жыццё і стаўленне да яе суседзяў. Як можна гэта зрабіць, куды звяртацца, каб аспрэчыць рашэнне?***

**Вольга К.**, *г. Шклоў.*



На пытанне адказвае **Дар'я ГРЫЦКЕВІЧ, галоўны спецыяліст упраўлення прававога рэгулявання сацыяльнай дзейнасці дзяржавы галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

— Каб вярнуць дзеяздольнасць вашай маці, вы можаце звярнуцца ў суд па месцы яе жыхарства з заявай аб прызнанні яе дзеяздольнай.

Згодна з артыкулам 29 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, узнаўленне асобы ў дзеяздольнасці магчымае ў тым выпадку, калі адпалі абставіны, якія паслужылі падставай для прызнання грамадзяніна недзеяздольным (напрыклад, пры значным паляпшэнні здароўя фізічнай асобы).

Пры гэтым па справах аб прызнанні грамадзяніна дзеяздольным асноўным доказам з'яўляецца заключэнне судова-псіхіятрычнай экспертызы, правядзенне якой па справах дадзенай катэгорыі абавязковае ў сілу артыкула 376 Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Заява аб прызнанні грамадзяніна дзеяздольным або аб адмене абмежавання яго дзеяздольнасці падаецца ў суд па месцы яго жыхарства. Пры гэтым не мае значэння, якім судом вынесена рашэнне аб абмежаванні дзеяздольнасці або аб прызнанні грамадзяніна недзеяздольным.

Справа можа быць пачата па заяве апекуна, а таксама членаў сям'і. Калі ў асобы, прызнанай недзеяздольнай, няма сям'і, заяву могуць падаць блізкія сваякі, пракурор, орган апекі і папячыцельства, псіхіятрычная (псіханеўралагічная) арганізацыя аховы здароўя. У гэтым выпадку пры падрыхтоўцы справы суддзя назначае судова-псіхіятрычную экспертызу.

Рашэнне суда аб адмене абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна або аб прызнанні яго дзеяздольным з'яўляецца падставай для адмены ўстаноўленых над ім апекі або папячыцельства.

***Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых устаноў мы будзем шукаць на іх адказы.***

Экаконкурс

# «НАША ЗАБОТА, А НЕ КОГО-ТО»

**Відэакліп з такой назвай пра карысць раздзельнага збору смецця стаў пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Героям спяваць лёгка», які зладзіла дзяржаўная ўстанова «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў». Аўтары найлепшай работы — вучні Наваполацкай школы № 12, у падарунак якой дастаўся камплект музычнага абсталявання з акустычнымі сістэмамі, мікшарным пультам і радыёмікрафонамі. А ўсе навучэнцы атрымалі наклейкі з янотамі і флікеры з карысными парадамі пра збор смецця. Прысутныя прысягнулі сартаваць смецце і заахвочваць да гэтай справы сваіх сяброў і родных.**



— Пры правільным сартаванні адходаў папера, шкло, пластык, метал ператвараюцца ў карысныя другасныя рэсурсы, якія становяцца новымі рэчамі. У выніку ў краіне менш звалак, а прырода захоўваецца больш. Каб гэта было зразумела кожнаму, мы прапанавалі школам зняць кліпы, якія пераканалі б беларусаў памяняць стаўленне да смецця, — падкрэсліла ідэю конкурсу яго арганізатар **дырэктар дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Наталля ГРЫНЦЭВІЧ.** — Журы было няпроста выбраць з больш як 400 цудоўных работ, дасланых на конкурс, але кліп наваполацкіх школьнікаў скарыў усіх сваёй ідэяй, лаканічнасцю і тэхнічным узроўнем.

Усяго пераможцамі конкурсу «Героям спяваць лёгка» сталі 11 школ краіны з 385 устаноў адукацыі, якія паўдзельнічалі ў творчым спаборніцтве. Самыя актыўныя, дарэчы, былі менавіта вучні Віцебскай вобласці: адсюль на конкурс трапіла 105 відэаролікаў. Усе конкурсныя работы можна ўбачыць на YouTube-канале «Героям спяваць лёгка».

Другое месца ў конкурсе прысудзілі вучням брэсцкага дзіцячага сада — пачатковай школы № 2 за кліп «Экамены Брэста». У падарунак яны атрымалі камплект музычнага абсталявання. Трэцяе і чацвёртае прызавыя месцы і мультымедыйныя праектары з экранамі дасталіся магілёўскай школе № 33 за ролік «Выратуем планету разам» і стаўбцоўскай школе № 2 за відэаработу «Экагёрл спяшаецца на дапамогу».

Школы, якія занялі прызавыя месцы ў конкурсе, узнагародзілі мультымедыйнымі праектарамі. Гэтыя прызы дасталіся школе № 2 г. Дуброўна за кліп «Героям спяваць лёгка», школе № 18 г. Гродна за кліп «Героям спяваць лёгка», гомельскай школе № 2 імя Г. М. Склязнёва за кліп «ВПК спяшаюцца на дапамогу!!!», школе № 19 г. Магілёва за кліп «Захаваем планету разам», гімназіі № 2 г. Гродна за кліп «Дзень маленькага экамена», школе № 3 г. Пружаны за кліп «Зялёны, жоўты, сіні — кожнаму класу!», вучэбна-педагагічнаму комплексу яслі-сад — сярэдняя школа в. Новае Поле за кліп «Добрыя справы».

**Ірына СІДАРОК.**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Чайка» 12 марта 2019 года

| Вид аукциона – открытый | Лот № 1* | Лот № 2 | Лот № 3 |
|---|---|---|---|
| Предмет аукциона | Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-86693 здание административно-хозяйственное (административное здание) общей площадью 384,8 кв. м. Год постройки – 1966 | Изолированное помещение с инвентарным номером 400/D-92426 неустановленного назначения (пункт проката) общей площадью 155,4 кв. м. Год постройки – 1979 | Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-21120 сооружение специализированное складов, хранилищ (центральный склад) общей площадью 144,0 кв. м. Год постройки – 1990 |
| Начальная цена продажи | **225 600,00 рублей** (с учетом НДС 20 %) | **68 640,00 рублей** (с учетом НДС 20 %) | **54 360,00 рублей** (с учетом НДС 20 %) |
| Кадастровые номера земельных участков и размеры | 440100000002005393, 0,0366 га | 440100000002003695, 0,1031 га (3/100 доли) | 440100000002003528, 0,0122 га |
| Месторасположение земельных участков | г. Гродно, пер. Дзержинского, д. 21 | г. Гродно, ул. Врублевского, д. 84 | г. Гродно, ул. Врублевского, д. 84 |
| Имущественное право земельных участков | Право постоянного пользования | Право постоянного пользования | Право постоянного пользования |
| Продавец | **Открытое акционерное общество по химической чистке одежды и стирке белья «Чайка», г. Гродно, ул. Зернова, 6, тел.: 8 (0152) 607302, 745502** | | |
| Сумма задатка | **6 768,00 рублей** | **2 059,20 рублей** | **1 630,80 рублей** |
| Организатор аукциона | **Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 720537, 720546** | | |
| Дата проведения аукциона | **12 марта 2019 года** | | |
| Время проведения аукциона | 12.00 | | |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** | | |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 | | |
| Дата и время начала приема документов | 11 февраля 2019 года, 8.00 | | |
| Дата и время окончания приема документов | 6 марта 2019 года, 17.00 | | |

*объект обременен договорами аренды.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже конфискованного имущества 12 марта 2019 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Условия продажи | Характеристика объекта |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-57608 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж) | г. Гродно, ул. Венечная, д. 2а, гаражный потребительский кооператив «Лососно-Новики», блок 25, гараж 44 | 2 608,20 | 260,82 | Без условий | Одноэтажное здание. Изолированное помещение гаража 44 общей площадью 16,4 кв. м. Материал стен – кирпич, перекрытия – железобетонные плиты, крыша – совмещенная, рулонная. Год постройки – 1985. Здание расположено на земельном участке с кадастровым номером 422000000009003073 общей площадью 8,2038 га |
| 2* | Изолированное помещение с инвентарным номером 400/D-108186 (назначение – квартира, наименование – квартира № 98) | г. Гродно, ул. Калиновского, д. 60, кв. 98 | 83 430,00 | 8 343,00 | Без условий | Квартира общей площадью 63,8 кв. м. Год постройки – 2009, стены – железобетонные панели, блоки, этаж – 13/14, количество комнат – 2 |
| 3* | Изолированное помещение с инвентарным номером 400/С-28212 (гараж 12) | г. Гродно, ул. Пушкина, д. 41а, гаражный кооператив «Центр-3», блок 16, гараж 12 | 3 744,00 | 374,40 | Без условий | Гараж площадью 19,6 кв. м расположен на земельном участке с кадастровым номером 440100000002004588. Фундамент – бетон, стены кирпичные, перекрытия – железобетонные, крыша – совмещенная рулонная, проемы – металлические ворота, полы – цемент, имеется подвал, электроснабжение – скрытая проводка |
| 4* | Капитальное строение с инвентарным номером 442/С-1860 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – павильон рынка) | Гродненская область, Островецкий район, Михалишковский с/с, д. Михалишки | 22 809,60 | 2 280,96 | Без условий | Одноэтажное здание общей площадью 477,6 кв. м Материал стен – блочно-кирпичные. Год постройки – 1989. Здание расположено на земельном участке с кадастровым номером 424682315101000070 общей площадью 1,0900 га |

*Лот продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, тел.: (0152) 720537, 74 2095, 720546.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

– Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

– **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Аукцион состоится 12 марта 2019 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **с 11 февраля по 6 марта 2019 года.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720537, 742095, 720546. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**.

Продавец: ООО «БелДрев» (УНП 500541442) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +375 29 130-85-30.

Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее – торги) будут проведены: **11 марта 2019 г**. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов, местонахождение | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Грузовой фургон GAZ-3307, рег. № АВ 1496-6, 2000 г. в., г. Гродно, ул. Карского, 2а | 800,00 р. |
| 2 | Грузовой специальный самосвал MAZ 5551-020, рег. № АЕ 3936-4, 2002 г. в., г. Гродно, ул. Карского, 2а | 5 200,00 р. |
| 3 | Полуприцеп-платформа тентовая Schmitz SPR 24, рег. № А 7765 А-4, 1998 г. в, г. Гродно, ул. Карского, 2а | 4 000,00 р. |
| 4 | Полуприцеп-платформа тентовая Trouillet ST3340, рег. № А 6305 А-4, 1989 г. в., г. Гродно, ул. Карского, 2а | 1 800,00 р. |
| 5 | Прицеп-платформа тентовая IN. PROIZV, рег. № А 5673 А-4, 1995 г., г. Гродно, Озерское шоссе, 20 | 3 500,00 р. |
| 6 | Прицеп-платформа тентовая IN. PROIZV, рег. № А 5672 А-4, 1991 г., г. Гродно, Озерское шоссе, 20 | 1 500,00 р. |
| 7 | Полуприцеп-платформа тентовая Koegel SN 24, рег.№ А 7810 А-4, 1997 г. в., г. Гродно, ул. Карского, 2а | 3 500,00 р. |
| 8 | Грузовой седельный тягач Volvo TF 12 F, рег. № АЕ 0662-4, 1989 г. в., г. Гродно, ул. Карского, 2а | 3 600,00 р. |
| 9 | Объект недвижимости – капитальное строение с инв. № 400/С-7159 (склад культтоваров) общей площадью 982,8 кв. м, г. Гродно, Озерское шоссе, 18б | 234 000,00 р. |
| 10 | Объект недвижимости – капитальное строение с инв. № 400/С-7157 (склад хозтоваров) общей площадью 1212,6 кв. м, г. Гродно, Озерское шоссе, 20 | 356 000,00 р. |
| 11 | Объект недвижимости – капитальное строение с инв. № 400/С-7096 (склад) общей площадью 1396,3 кв. м, котел стальной твердотопливный бытовой КСТБ-95 (инв. № 905), г. Гродно, Озерское шоссе, 20 | 347 400,00 р. |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18. Шаг торгов и задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. **Для участия в торгах необходимо в срок по 7 марта 2019 г. до 17.00:** 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация»; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY; 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Оформление результатов торгов в день их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| **Продавец** | ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| Лот № | Марка, модель, тип кузова или наименование установленного оборудования, рег. знак, год выпуска | Инвентарный номер | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **ЗИЛ-131**, грузовой бортовой, 9348 АЕ-5, 1975 | 100000013651 | 4 200,00 |
| 2 | **ВАЗ-21310**, легковой, 1368 АС-5, 2003 | 100000013711 | 2 880,00 |
| 3 | **УАЗ-3163**, легковой, 3927 АС-5, 2005 | 100000013713 | 4 800,00 |
| 4 | **ГАЗ-2705**, фургон, АВ 7846-5, 2007 | 100000013678 | 3 240,00 |
| 5 | **ГАЗ-33023**, грузопассажирский бортовой, АА 7926-5, 2006 | 100000013675 | 3 360,00 |
| 6 | **ГАЗ-3307**, грузовой бортовой, АА 6841-5, 1990 (по ТП не определен), установлена кабина 2010 г. в. | 100000013670 | 2 040,00 |
| 7 | **FAUN WERNE**, седельный тягач, 9483АЕ-5, 1982. **Scheuerle**, полуприцеп-тяжеловоз, 9483АЕ-5, 1984 | 100000013648 100000013649 | 26 280,00 |
| 8 | **УАЗ-3909**, фургон, АН 2908-5, 2004 | 100000013664 | 1 440,00 |
| 9 | **УАЗ-39099**, фургон, АА 5799-5, 2005 | 100000013668 | 1 440,00 |
| Лоты №№ 1–9 находятся по адресу: аг. Староселье, Крупский район, Минская область, филиал «Крупское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь» | | | |
| 10 | **УАЗ-3163**, легковой, 0220 АС-5, 2005 | 100000016203 | 4 800,00 |
| 11 | **ВАЗ-2131**, легковой, 0427 IХ-5, 2003 | 100000016218 | 1 440,00 |
| 12 | **ГАЗ-3110**, легковой, 1360 IХ-5, 2001 | 100000016200 | 1 116,00 |
| 13 | **УАЗ-23632-232,** пикап, АК 1122-5, 2010 | 100000016192 | 6 000,00 |
| Лоты №№ 10–13 находятся по адресу: аг. Михановичи, Минский район, филиал «Минское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь» | | | |
| 14 | **УАЗ-23632**, пикап, АI 9381-5, 2010 | 100000039284 | 8 880,00 |
| 15 | **УАЗ-31514**, легковой, 3507 IР-5, 2003 (по ТП не определен), установлен кузов 2012 г. в. | 100000038757 | 7 680,00 |
| 16 | **FAUN WERNE**, седельный тягач, 6725 АМ-5, 1982. **Scheuerle**, полуприцеп-тяжеловоз, 6725 АМ-5, 1982 | 100000039948 100000039947 | 26 280,00 |
| Лоты №№14-16 находятся по адресу: г. Несвиж, ул. Сновская, Минская область, филиал «Несвижское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь» | | | |
| 17 | **МАЗ-5516**, самосвал, АI 2001-4, 2001 | 100000031888 | 8 880,00 |
| Лот № 17 находится по адресу: ул. Гродненское шоссе, 6А, г. Слоним, Гродненская область, филиал «Слонимское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь» | | | |
| 18 | **УАЗ-3163-030**, легковой, 4480 ВТ-1, 2005 | 100000046391 | 4 800,00 |
| 19 | **ГАЗ 66-11 ВМ2001**, автобус вахтовый, АВ 8742-1, 1991 | 100000046410 | 4 440,00 |
| 20 | **УАЗ-3909**, фургон, АI 8844-1, 2004 | 100000046340 | 1 440,00 |
| Лоты №№ 18–20 находятся по адресу: ул. Дзержинского, 135, г. Кобрин, Брестская область, филиал «Кобринское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь» | | | |
| 21 | **Урал-4320**, экскаватор автомобильный, АЕ 3656-6, 1997 | 100000020422 | 25 440,00 |
| Лот № 21 находится по адресу: аг. Лапичи, Осиповичский район, Могилевская область, филиал «Осиповичское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь» | | | |
| 22 | **УАЗ-390995-330**, фургон, АЕ 8424-3, 2010 | 100000021905 | 4 080,00 |
| 23 | **ГАЗ-2752**, фургон, АВ 2651-3, 2007 | 100000021889 | 3 600,00 |
| 24 | **ГАЗ-32213**, автобус-вагон, АА 3353-3, 2006 | 100000021947 | 2 880,00 |
| Лоты №№ 22–24 находятся по адресу: Урицкий с/с,1, Гомельский район, Гомельская область, филиал «Гомельское УМГ ОАО «Газпром трансгаз Беларусь» | | | |
| 25 | **МАЗ-533702,** автокран, АО 3943-5, 2005 | 100000037724 | 26 280,00 |
| 26 | **МАЗ 8926***, прицеп бортовой, 8377 АА-5, 1988 (по ТП не определен) * номер рамы уничтожен, без права снятия с учета в течение 3 лет, заключение УВД Миноблисполкома от 07.10.2013 | 100000042858 | 1 680,00 |
| 27 | **МАЗ 6317**, фургон-мастерская, АО 4742-5, 2000 | 100000031912 | 14 160,00 |
| 28 | **КРАЗ 260-010**, фургон-мастерская, АО 1883-5, 1995 | 100000031911 | 7 560,00 |
| Лоты №№ 25–28 находится по адресу: ул. Либаво-Роменская, 165, г. Молодечно, филиал «Молодечненское УБР ОАО «Газпром трансгаз Беларусь» | | | |
| 29 | **ГАЗ-2752**, фургон, АВ 7877-7, 2007 | 100000036568 | 2 760,00 |
| 30 | **ГАЗ-33081**, фургон-мастерская, АА 2215-7, 2005 | 100000036553 | 8 040,00 |
| 31 | **ГАЗ-33081**, фургон-мастерская, АА 2216-7, 2005 | 100000036551 | 8 040,00 |
| 32 | **ГАЗ-33081**, фургон-мастерская, АА 2217-7, 2005 | 100000036552 | 8 040,00 |
| 33 | **ГАЗ-2752**, фургон, АА 0974-7, 2005 | 100000036544 | 2 760,00 |
| Лоты №№ 29–33 находятся по адресу: ул. Ф. Скорины, 4, г. Минск, Управление «Минскавтогаз» | | | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов, имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата, время и место проведения электронных торгов: по лотам №№ 1–17 – 13.03.2019, по лотам №№ 18–33 – 14.03.2019.** Начало проведения электронных торгов – 10.00, каждый следующий лот с интервалом 10 минут, на ЭТП «ИПМ-Торги» **www.ipmtorgi.by** Аккредитованному участнику, подавшему на адрес организатора торгов пакет документов и прошедшему предварительную регистрацию, ЭТП предоставляется время до начала торгов в режиме реального времени для заключительной регистрации (начало заключительной регистрации за 2 часа до начала электронных торгов). В случае не прохождения регистрации участник к торгам не допускается. После прохождения регистрации участник получает доступ в аукционную комнату, где ожидает старта торгов в режиме онлайн

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация)** | **11.03.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42; auction@cpo.by** |



## Арнольд СМЕЯНОВІЧ:

# «ДУМАЙ ПРА ДОБРАЕ»

**Ёсць шчаслівыя людзі сярод нас... Яны і ў 80 жывуць, захапляючыся ўсім, што пашырае свядомасць, прымнажае радасць. І людзьмі ў тым ліку захапляюцца. Такі Арнольд Смеяновіч, таленавіты нейрахірург-аптыміст. Пазітыўнае стаўленне да жыцця ў яго пругкае, заразлівае настолькі, што пасля зносін з ім яшчэ раз сабе скажаш: і сапраўды, мы ў гэты свет прыходзім — для радасці.**

ЗДАВАЛАСЯ б, ну што такога новага можна пабачыць у сваёй працы, якой аддаў 58 гадоў жыцця? Хворыя людзі, аперацыі, вучні, цякучка... Ды і ў самім жыцці ўжо многа чаго ўбачана, пережыта... Тым не менш цікавасць да яго ў Смеяновіча — свежая, непадробная. Можа, таму, меркавалі мы спачатку, што мае Арнольд Фёдаравіч справу з такім неспазнаным цудам, як мозг чалавека? Задалі пытанне суразмоўніку, ці знайшоў ён ключ да таямніцы мозга, а ён і не здзівіўся нават: маўляў, вашыя калегі не раз пра тое пыталіся.

— І сапраўды, гэта цуд! — адказаў. — Ключом, каб адкрыць яго таямніцу, я не валодаю, хоць і бачу амаль штодзень. Мозг — найвялікшая таямніца за сямю пячаткамі. Прычым не шэрае гэта рэчыва, як часам кажуць: ён — далікатна-крэмавага колеру, вельмі прыгожы. Магу толькі захапляцца прыродай, творцам, які яго стварыў.

І далей разважаў:

— Мозг — велізарны банк ведаў. Сусветная энцыклапедыя. Як усё ў ім працуе? Таямніца... На любы сігнал ад нерва, вачэй, вушэй у ім ствараецца «карцінка». Але як мы адрозніваем, што вунь, за акном (ківае ў бок акна) кошка сядзіць пад ружамі, а гэта вось мой рабочы стол, а пад шклом — фотаздымак бацькі, паглядзіце! Афіцэр Фёдар Смеяновіч. Загінуў у 1943-м, быў начальнікам штаба дэсантнай брыгады... Там, побач са здымкам, выслоўі вялікіх розумаў: я афарызмы часам выразаю для сябе... А вось на сцяне партрэт майго настаўніка Эфраіма Злотніка, з якога пачалося маё ўваходжанне ў нейрахірургію... Ну а гэта вы, мае госці... Неверагодна! Адно ведаю: мозг — вельмі магутная машына, ён мацнейшы за любы суперкамп'ютар! І як ён так хутка «круціцца» — не разумею! Адкуль у ім думкі бяруцца? Тэорыі, гіпотэзы, адкрыцці... Я часта прыводжу прыклады для тых, каго цікавяць таямніцы мозга. Лаўрэат дзвюх Дзяржаўных прэмій СССР хірург Война-Ясянецкі, ён жа архіепіскап Лука, гаварыў: «Роля мозга зводзіцца да выдачы паведамлення» — і параўноўваў яго з тэлефоннай станцыяй. (Дарэчы, родавыя карані ў таго знакамітага хірурга і святара былі з Беларусі. — **Аўт.**) І акадэмік Наталля Бехцерава лічыла, што мозг чалавека здольны ствараць толькі найпрасцейшыя думкі, ён нічога не дадае да таго, што атрымлівае. А Джон Эклс, нобелеўскі лаўрэат па фізіялогіі ды медыцыне, наогул лічыў: мозг думкі не «вырабляе», а толькі ўспрымае іх звонку...

Цікава? Нам вельмі цікава было тую міні-лекцыю слухаць. І нават не факты здзівілялі, а імпэт нашага візаві. Уражвала яго дапытлівасць, неабыякавасць, бо такое ж нячаста сустрэнеш у такім паважным узросце.

Удумацца толькі: за 58 гадоў практыкі Арнольд Фёдаравіч ажыццявіў аперацыі на мозгу каля 10 000 пацыентаў. І напэўна, калі яны прыходзілі ў сябе з надзеяй, што ўсё дрэннае засталося ў мінулым, доктар Смеяновіч чытаў радасць у іх вачах. І казаў: радуйцеся кожнай хвіліне — цяпер вы можаце не хвалявацца... Ён і сам кожны раз радуецца, калі ёсць станоўчы вынік у найскладанейшых аперацый, якіх за год праводзіць, як правіла, каля 250. Дарэчы, нікому, хто звяртаецца да яго па дапамогу, прызнаўся, не адмаўляе.

Арнольд Смеяновіч — гэта цэлая эпоха ў нейрахірургіі, як кажуць у падобных выпадках. Ды сам аксакал, праўда, ад такога параўнання адмахваецца. Усё прасцей, кажа. Ну, працуе ў медыцыне з 1963 года. Прычым яшчэ ў Дрыбінскай сельскай бальніцы, куды разам з жонкай Тамарай Іванаўнай пасля Мінскага медінстытута размеркаваўся, усвядоміў, як трэба трымаць клятву Гіпакрата. І што гэта за стан душы такі, калі ты вельмі неабходны людзям, якія забыліся пра радасць жыцця з-за праблем са здароўем. І падтрымаць іх трэба, і ўпэўненасць усяліць ва ўдалым зыходзе аперацыі, і мець мужнасць прыняць жорсткую рэальнасць, боль і слёзы, калі ты не змог, як ні стараўся, апраўдаць чужыя надзеі...

Досвед працы ў сельскай бальніцы на Магілёўшчыне, лічыць Арнольд Смеяновіч, незаменны, і людзей, якім там за тры гады спатрэбіўся, было вельмі шмат. А дарогу жыцця ён прайшоў вялікую, і не заўсёды, вядома, усё на ёй было лёгка і проста. І душа, здаралася, балела, і здавалася часам: жыццё рушыцца... Але і тое праходзіла, як бывае ў жыцці, калі за паласой крыўдаў і расчараванняў надыходзіць момант, калі ўсё ладзіцца. Важнае адкрыццё такое ён зрабіў яшчэ ў маладосці. А потым, назіраючы рытмы жыцця ў фармаце «плюс-мінус», навучыўся пераносіць яго цяжкасці. Відаць, таму ў спакойным, дабрадушным абліччы Арнольда Фёдаравіча глыбінны мацярык ягонай радасці праглядаецца.

Да гэтага дня высокае майстэрства гэтага нейрахірурга ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры неўралогіі і нейрахірургіі, абсталяваным самай сучаснай апаратурай еўрапейскага ўзроўню, — запатрабаванае. Практычна ніводная складаная аперацыя на мозгу без прафесара Смеяновіча не абыходзіцца. І праца яго па заслугах ацэнена.

І дзеці ў іх з Тамарай Іванаўнай — медыкі. Сын, Віталь Арнольдавіч, ужо таксама вядомы нейрахірург, загадвае аддзяленнем нейрахірургіі і неўралогіі № 1 ў РНПЦ. А дачка Вольга — стаматолаг, на кіраўнічай пасадзе. І каштоўныя складнікі сямейнага шчасця — трое ўнукаў і ўнучка — радуюць дзядулю і бабулю. Больш за тое: старэйшы, Стас, вучыцца ў Беларускім дзяржаўным медуніверсітэце. І нават праўнучка ўжо сямейны клан упрыгожыла.

Чамусьці мы (потым разважалі) забыліся распытаць у Арнольда Фёдаравіча: можа, чытаў і ён кнігу пра дзяўчынку Паліяну, гераіню аднайменнага амерыканскага бестселера Элінор Портэр? Любімай гульнёй Паліяны, што б у жыцці ні здаралася, была «гульня ў радасць». Вось такім універсальным «гаджэтам» яна карысталася, каб адчуваць сябе шчаслівай.

Зрэшты, адна справа — чытаць, іншая — зрабіць філасофію радасці мелодыяй свайго жыцця... Выказвалі версіі: адкуль у гэтым чалавеку столькі цікавасці да жыцця, столькі пазітыву? Зноў гены? І прыйшлі да высновы: пэўна ж, такім ён нарадзіўся на сваёй Пухавіччыне... Бо і сам пацвярджае: пазітыўнае стаўленне да жыцця ў яго — ад сям'і, ад мамы, Галіны Лукінічны, добрай і мудрай. Усё будзе добра, гаворыць ён, толькі пры ўмове, калі ты будзеш думаць пра добрае. Чым больш чалавек незадаволены жыццём, чым больш думае пра дрэннае — тым болей шанцаў, што такім ягонае жыццё і будзе. Таму лепш старацца радавацца, а не мучыцца. А яшчэ — дабро людзям рабіць. І не сумнявацца, што жыццё — гэта падарунак Творцы.



www.sb.by

Можа, у гэтым і ёсць: таямніца радасці? Мозга? Быцця?..

Дарэчы, самому Арнольду Смеяновічу пашчасціла застацца ў жывых тады, калі, здавалася, гэта было немагчыма. Ішла Вялікая Айчынная вайна. У акупаванай немцамі вёсцы Пухавічы стаяла шмат ваеннай тэхнікі. Арыку было тады шэсць гадоў, калі з сябруком з суседняе хаты яны вырашылі пракаціцца на прычэпе ваеннай машыны. Ды, падбягаючы, зачапіўся хлапчук за нешта, не разлічыўшы сілы, і ўпаў — проста пад колы. Яго колам адразу і пераехала. Выратаваў Арыка нямецкі лекар-хірург. Вось тады — Арнольд Фёдаравіч добра памятае — бабуля і напрарочыла: быць табе хірургам, калі цябе хірург выратаваў. А ён жа — лётчыкам стаць марыў. Аднак долю сваю, як кажуць беларусы, на кані не аб'едзеш: на медкамісіі зрок падвёў — і лінія лёсу прывяла яго ў хірургі.

І яшчэ, згадвае Арнольд Фёдаравіч, быў з ім у дзяцінстве другі, таксама смяротна небяспечны выпадак. У Пухавічах да вайны жыло шмат яўрэйскіх сем'яў. Калі ж прыйшлі гітлераўцы, то яўрэяў паўсюль вынішчалі. Аднойчы і пухавіцкіх сагналі ды павялі па вуліцы, а бабуля з унукам Арыкам выскачылі з хаты — паглядзець, што там робіцца. Дык іх таксама немцы загналі ў натоўп: бабуля ж і ўнук былі смуглыя. Пэўна, не абмінуць бы ім расстрэлу, калі б не жанчыны, якія стаялі побач. Яны і выцягнулі Арнольда з бабуляй з натоўпу. А бядотнікаў тых усіх, як потым чутка пайшла, расстралялі. Вось так і распарадзіўся лёс Арнольда Смеяновіча: жывым яму быць — і ратаваць іншых ад смерці. Што ён і робіць. Паколькі ведае: жыццё нам дадзена — для радасці. І тое ўвасабляе. А радасць высвечваецца ў яго мімічных зморшчынах вакол вачэй. І ў хуткай, зацікаўленай рэакцыі на любое пытанне. І ў шчырых адказах, якія могуць гучаць зусім па-дзіцячы, адкрыта: «Ды я не ведаю» ці «А хто ж яго ведае»...

Ён быў з намі ўвесь з сябе — вельмі натуральны, сапраўдны. Не спрабаваў выглядаць, здавацца нейкім іншым, чым ёсць. Таму, як нам падаецца, і не можа ён не падабацца. Ужо адной прысутнасцю сваёй гэты Доктар — лечыць. Як моцны генератар здаровай энергетыкі.

**Валянціна ЖДАНОВІЧ,**
**Іван ЖДАНОВІЧ.**

**З біяграфіі.**

*Арнольд Смеяновіч — прафесар, загадчык нейрахірургічнага аддзела ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры неўралогіі і нейрахірургіі.*

*Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар медыцынскіх навук, заслужаны дзеяч навукі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.*

*Ганаровы член Асацыяцыі нейрахірургаў Расіі. У 1997—2005 гадах быў дырэктарам НДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі. Аўтар 25 вынаходак і патэнтаў, мае больш за 400 навуковых прац, у тым ліку 7 манаграфій. Сярод шматлікіх узнагарод ёсць і ордэн Айчыны III ступені.*

ПЯЦЬ КАПЕЕК

# ТЭОРЫЯ АДНОСНАСЦІ, або Аб тым, што доктар прапісаў

**Шмат сяброў — не бывае. Любімых кніг — таксама. Трэба «...Цёркіна» перачытаць. Гэта ж як там?**

*Смерть есть смерть. Ее прихода*
*Все мы ждем по старине.*
*А в какое время года*
*Легче гибнуть на войне?*

Актуальнае пытанне. Як і адказ:

*...Если горько гибнуть летом,*
*Если осенью — не мед,*
*Если в зиму дрожь берет,*
*То весной, друзья, от этой*
*Подлой штуки — душу рвет.*

А калі дадаць яшчэ, што тая вясна была пераможнай (!), што немцаў — пагналі і гэта ўжо беззваротна, што зараз жыць бы ды жыць, нешта сеяць, падымаць дзяцей...

Іх у таго партызана было пяцёра — чацвёра сынкоў і трохмесячная дачка. «Беражы іх», — жонцы сказаў, і гэта былі яго апошнія словы.

Цяжка даліся. А ўжо ёй наказ... Голад, вайна, падмогі ніякай — ні ад дзяржавы, ні ад радні. Да ўсяго тое найменшае дзіця — хворае і ніколі, кажуць, не будзе хадзіць...

Хапіла матулі напоўніцу. Ела — не ела, спала — не спала, але ж цягнула свой воз — нават не могучы: вельмі балела сэрца. І яно б трэба, здавалася, на нешта адважыцца, некуды ісці — шукаць ратунку. А дзе? Ну, здасца яна, ну, паедзе да дактароў. А далей што? У бальніцу ж не ляжаш — дзеці. Лекаў купіць таксама няма за што...

Вось нікуды і не ездзіла.

На вуліцы неяк сустрэла доктара, проста так, «для парадку», спытала, можа, параіць ёй што — ад сэрца?

Той бяду яе ведаў, трохі падумаў і пачаў здалёк:

— Вось у цябе, — сказаў, — ёсць суседзі — і справа, і злева. Першы — той досыць добра жыве, яго дзеці шмат чаго маюць. А вось другі, той, што злева, — гаротнік. У параўнанні з ім нават вы багацеі! Я праўду кажу?

— Праўду...

— Дык вось што нараю: ты старайся менш глядзець направа, на тое, як жыве багацейшы сусед. Глядзі — як бедны... Тады і сэрцу будзе лягчэй.

Не сказаць, што ўдава адразу тым словам паверыла, але ж неяк павесялела, а потым — паспрабавала, і ёй, як ні дзіўна, дапамагло! Хоць на шостым годзе жыцця ды стала хадзіць дачушка, выжылі і сынкі! Усе пяцёра яе дзяцей змалку працавалі і добра вучыліся ў школе, атрымалі вышэйшую адукацыю — выйшлі ў людзі. І — галоўнае — сярод іх засталіся, ніколі не зайздросцілі чужому багаццю, дзяліліся, хай апошнім, сваім: помнілі тое, што «доктар прапісаў».

**Валянціна ДОЎНАР.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 5 (447)

# НАПАЧАТКУ БЫЛА ЛІТАРАТУРА

## Пра што гутарылі на міжнародным сімпозіуме літаратараў?

**На міжнародным сімпозіуме літаратараў, на якім сёлета на адным пасяджэнні выступіла 19 аўтараў з розных краін, як заўсёды, было горача. Кожнаму было што сказаць — і хацелася гэта зрабіць! Бо такія людзі пісьменнікі.**
**Іх справа — крышачку змяняць наш свет.**
**Сімпозіум, які праходзіў у межах XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, дапамог ім адчуць і зразумець — а што ж думаюць іншыя, на што скіроўваюць свае творчыя погляды?**
**Такім чынам, размова адбылася! Толькі некаторыя вытрымкі з яе мы сабралі ў нашым матэрыяле.**




**Міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ:**

— Сімпозіум з'яўляецца пляцоўкай для ўмацавання міралюбівых і добрасуседскіх адносін. Пяты раз у краіне сабраліся пісьменнікі з розных краін — Беларусі, Расіі, Азербайджана, Вялікабрытаніі, Венгрыі, Германіі, Італіі, Казахстана, Латвіі, Літвы, Малдовы, ЗША, Таджыкістана, Узбекістана, Украіны, Францыі. Традыцыя нашага сімпозіума вырасла з тых круглых сталоў, якія праходзяць у рамках Дня беларускага пісьменства ў верасні кожнага года, пачынаючы з 2007-га. Калі мы задумваліся пра мэты сімпозіума, які праводзіцца з 2015 года, то спадзяваліся на тое, што ён стане пляцоўкай для міралюбівых добрасуседскіх адносін у гуманітарнай сферы, галіне культуры, літаратуры, мастацтва. Круглы стол і сімпозіум дапамагаюць злучыцца перакладчыкам розных краін, дзякуючы якім беларускую літаратуру пачынаюць прадстаўляць шырэй у свеце. Такім чынам мы пераходзім ад размоў пра раз'яднанасць, да справы, якія вядуць да яднання, кансалідацыі і асэнсавання таго, што мы павінны быць разам. А нашым памочнікам у дасягненні добрых намераў павінна стаць мастацкае слова.



**Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ:**

— Мінская кніжная выстаўка настройвае на творчасць. Хачу звярнуць увагу, што нам усім патрэбна да таго ж і літаратурная крытыка. Прычым не проста добрая, а канструктыўная, якая дае як магчымасць адчуць значнасць сваёй працы, так і ўбачыць недахопы і памылкі. Але рабіць гэта трэба такім чынам, каб пісьменнік зразумеў, што яго не прыніжаюць і не абражаюць, а дапамагаюць ствараць. Важна займацца і мастацкімі перакладамі, і найбольш выдатна, каб творы перакладаліся менавіта носьбітамі мовы. Было б нядрэнна стварыць асацыяцыю перакладчыкаў, крытыкаў-міжнароднікаў, якія б «задавалі тон правільнасці перакладу»... Хачу падзяліцца адным сакрэтам. Часам чыноўнікі не хочуць прызнаваць пісьменнікаў, прыходзіцца штосьці даводзіць першым. Аднак нам трэба часцей нагадваць ім адну ісціну. Чым адрозніваецца чыноўнік ад пісьменніка? Тым, што пісьменніка ніколі не назавуць былым.

**Старшыня Саюза пісьменнікаў Дагестана, народны паэт Магамед АХМЕДАЎ:**

— Часы змяняюцца, змяняюцца і пісьменнікі. Але застаецца вечнае: гэта наша Радзіма, наша мова, наш род. Паэзія — вяршыня ўсяго. Веліч народаў вызначаецца веліччу яго паэзіі. Што ёсць у народа самага дасканалага, самага бясцэннага, самага вышыннага? Гэта яго мова. Без мовы народ не існуе. А ў мовы ёе вяршыня — паэты. Пра гэта асабліва сёння даводзіцца думаць і казаць, бо паўсюдна ідзе глабалізацыя. І калі вялікія народы і мовы яшчэ могуць гэта вытрымаць, то калі гэта даходзіць да малалікіх народаў і іх моў, узнікаюць праблемы. Таму кожны чалавек, кожны праект, па-сапраўднаму таленавіты аб Бога, нясе ў сабе зарад сваёй старажытнай, багатай, малітоўнай, роднай мовы — у гэтым выяўляецца багацце. У Дагестане заўсёды была малітва — перад родамі, перад бітвай, перад маці, перад жанчынай. Таму ў свой час Дагестан нарадзіў вялікага паэта Расула Гамзатава, якога можна было назваць народным паэтам усяго Савецкага Саюза. Дагэтуль яго вершы і песні гучаць, іх ведаюць, іх любяць, іх перакладаюць. Яго вершы сталі з'явай у літаратуры.

**«Эпоха постмадэрну, страты каштоўнасцяў, стаўкі на камунікацыю і спажыванне, сферу паслуг — усё гэта сыдзе».**

**Дырэктар Інстытута літаратуры і мастацтва імя Аўэзава ў Казахстане Кенжахан МАТЫЖАНАЎ:**

— 2019 год аб'яўлены ў СНД Годам культуры. Папулярызацыя чытання і нацыянальных літаратур стануць ключавымі для многіх форумаў і сустрэч. Старт усім будучым праектам сёння даюць беларусы, акрэсліваючы кірункі далейшага культурнага, літаратурнага супрацоўніцтва... Гісторыка-культурны шлях народа, як вядома, захоўваюць і перадаюць будучым пакаленням нацыянальныя літаратуры. Чытаючы літаратуру іншай краіны, мы лепш разумеем яе народ. Узбагачэнне нацыянальных літаратур сусветным вопытам адбываецца праз пераклад мастацкіх літаратур, актуальнасць і значнасць якога ў XXI стагоддзі ўзрастае. У Казахстане паспяхова рэалізуецца праграма, ініцыяваная прэзідэнтам Нурсултанам Назарбаевым, у межах праекта па перакладзе найлепшых твораў мастацкай літаратуры на шэсць моў народаў свету.

**Публіцыст, перакладчык, пісьменнік са Славакіі Мар'ян СЕРВАТКА:**

— Што значыць сур'ёзны пераклад? Ён можа мець пазітыўны ўплыў і негатыўны. Я ўспамінаю жарт пра тое, што такое паэзія? Кажуць, што паэзія — гэта тое, што руйнуецца пры перакладзе. Аднак такі падыход — не заўсёды праўда. Напачатку культуры заўсёды было слова. Пачынаючы ад Святога Пісання. Аднак у пачатку славацкай культуры быў пераклад слова. Вось чаму ён настолькі важны.

**Кіраўнік апарату Цэнтра перакладаў пры Кабінеце Міністраў Азербайджанскай Рэспублікі Яшар АЛІЕЎ:**

— Больш за 20 гадоў наш Цэнтр перакладаў выконвае важную місію па збліжэнні культур, наладжванні літаратурных сувязяў, плённым супрацоўніцтве ў літаратурнай творчасці. 20 гадоў Цэнтр перакладаў быў грамадскай арганізацыяй. Аднак у 2014 годзе атрымаў статус установы. За гэты час цэнтрам была зроблена велізарная работа па прапагандзе азербайджанскай літаратуры ва ўсім свеце. Таксама мы знаёмілі чытачоў з сапраўднымі скарбамі сусветнай літаратуры, перакладаючы творы такіх масцітых аўтараў як Франц Кафка, Томас Вулф і іншыя. Нават у самыя цяжкія часы мы не зламаліся пад ціскам матэрыяльных цяжкасцяў, але засталіся вернымі высокадухоўнай літаратуры. Сярод твораў, з якімі мы працуем, не сустрэнеш белетрыстыкі, якую так любяць чытачы. Наданне новага статусу адкрыла перад цэнтрам новыя магчымасці. Мы сталі займацца перакладамі на зусім новым узроўні. Ніколі азербайджанская літаратура не была прадстаўлена сусветнаму чытачу так маштабна.

**Галоўны рэдактар «Литературной газеты» Максім ЗАМШАЎ:**

— У размовах пра мастацкую літаратуру трэба падзяляць, што пішуць, што выдаюць і як прапагандуюць. Бо тут ёсць пэўная неадпаведнасць. Выдавецкі свет не такі шырокі, сур'ёзная літаратура, магчыма, не карыстаецца такім вялікім попытам у чытача на рынку. Кнігарні павінны хутка прадаваць, каб выжыць. А мастацкая літаратура не прадаецца так лёгка і актыўна, як, напрыклад, кнігі па здаровым ладзе жыцця. Але на самай справе праблем з мастацкай літаратурай у Расіі няма. Калі вы пагледзіце кароткія і доўгія спісы літаратурных прэмій, то ўбачыце велізарную колькасць імёнаў, 40—50 новых кніг высокага ўзроўню. Да таго ж прыгадаем прадстаўлены на выстаўцы сур'ёзны мастацкі раман «Брысбен» Яўгена Вадалазкіна, які выйшаў накладам у 35 тысяч асобнікаў. Гэта велізарны наклад для нашага часу. Хоць пяць-шэсць гадоў таму Яўген Вадалазкін быў нікому не вядомы, працаваў навукоўцам, не пісаў мастацкую прозу. З іншага боку, ёсць крызіс чытання, людзі аб'ектыўна сталі менш чытаць. І тут справа нават не ў тэмпе жыцця. Проста мы перасталі працаваць над сабой, будаваць уласную асобу, а чытанне акурат вельмі важнае. Але гэта пройдзе. Эпоха постмадэрну, страты каштоўнасцяў, стаўкі на камунікацыю і спажыванне, сферу паслуг — усё гэта сыдзе.

**«Зрабіць так, каб айцішнікі, гэтыя дасведчаныя ў тэхналогіях, разумныя людзі, працавалі з паэтамі і пісьменнікамі, дапамагалі ім».**

**Празаік, публіцыст з ЗША Вікторыя КІНГ:**

— На маю думку, нацыянальная культура і літаратура здольны паўплываць на развіццё планетарнай свядомасці. Якім чынам у глабалізаваным свеце будзе існаваць піксель маёй культуры? Наколькі нацыянальны пісьменнік здольны стварыць героя, у якім будзе ідэнтычнасць як з яго мясцовымі рысамі, так і з планетарнымі? Я мяркую, што сучасныя тэхналогіі трэба зрабіць нашай зброяй. На сёння ўжо існуе інстаграм-паэзія. Аднак хто з паэтаў, прысутных на сімпозіуме, па-сапраўднаму там працуе? А палова моладзі сядзіць менавіта на гэтай платформе. Трэба свае вершы дадаваць да пэўных візуальных вобразаў — і такім чынам выходзіць на маладых людзей. Даваць ім свае ідэі, сваё ўспрыманне свету і чалавека... Нам павінны дапамагчы чыноўнікі. І зрабіць так, каб айцішнікі, гэтыя дасведчаныя ў тэхналогіях, разумныя людзі, працавалі з паэтамі і пісьменнікамі і дапамагалі ім.

**«З іншага боку, ёсць крызіс чытання, людзі аб'ектыўна сталі менш чытаць. І тут справа не ў тэмпе жыцця».**

**Публіцыст, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Наш современник» Аляксандр КАЗІНЦАЎ:**

— Я прыязджаю ў Беларусь ужо раз дваццаты. І кожны раз раблю адно і тое ж — прашу нашых сяброў, беларускіх пісьменнікаў, даваць свае творы для публікацыі ў нашым часопісе. Кожны год сёмы нумар часопіса прысвечаны Беларусі. Аднак з кожным годам гэта робіцца ўсё цяжэй. Дзесьці з-за бядотнага стану часопісаў. Некалькі гадоў мы казалі пра тое, што часопісы на мяжы выжывання. І вось, здаецца, мяжа пяройдзена. Прыпынілі сваю работу часопісы «Октябрь», «Ореон», сама зала, якая прадстаўляла часопісы, закрылася. Натуральна, справа ў няўважлівасці ўлады. І тут гаварыць варта не пра змову, а проста пра невуцтва. Колькі разоў літаратура ў Расіі выжывала незалежна ад улады, а ў супрацьборстве ўладзе, за кошт любові чытача. Невыпадкова, што, калі яна не адчувала гэтай любові, яна гаварыла трагічным голасам... Каб было пачута слова беларускіх пісьменнікаў, пра тое, якія гэта людзі, з гонарам, што змагаліся за сваю незалежнасць у Вялікую Айчынную вайну! Многіх дзіўных ідэй, якія гучаць у Расіі сёння адносна вашай краіны, можна было б пазбегнуць.

**Пісьменнік, публіцыст з Францыі Рамірас ЛОІК:**

— Я журналіст, працую ў Францыі і пішу кнігу пра Беларусь. У маім выданні расказваецца ў тым ліку пра тое, як у заходніх СМІ асвятляецца Беларусь. Частка маёй працы прысвечана таму, у якіх сферах Беларусь дасягнула поспеху. Я размаўляў з людзьмі, якія адказваюць за ахову навакольнага асяроддзя ў вашай краіне. І зразумеў, што палітыка аховы навакольнага асяроддзя нашмат лепш развіта ў Беларусі, чым у іншых краінах. Асабліва гэта датычыцца лясоў на тэрыторыі Брэстчыны. Спадзяюся, мая кніга адкрые Беларусь французам і іншым людзям.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Кастуся ДРОБАВА.**

Кінакрокі

# ЧЫМ БАГАТЫ?

## Новыя дакументальныя фільмы: пра што здымае Нацыянальная кінастудыя

**«Беларусьфільм» паказаў нам створаныя за мінулы год дакументальныя карціны, прычым з агаворкай: рэжысёры, маўляў, нарэшце займаліся «сваімі» тэмамі. Агаворка важная, таму што дагэтуль студыя дакументальнага кіно «Летапіс» больш выконвала заказы, якія вельмі ўмоўна ўпісваліся ў кантэкст мастацтва, інтарэс да яе прадукту імкліва падаў. Але вось, здаецца, кірунак ветру змяніўся і на «Беларусьфільме» з'явіліся прывабныя карціны аб працы хуткай дапамогі, шахцёрах і кіраўніку народнага хору ў правінцыі, пра УНОВИС і пахавальную традыцыю Радзівілаў. Па гамбургскім рахунку, нічога звышнатуральнага, а для «Летапіса» апошніх гадоў — добрыя перамены.**

### «СВАЕ» ТЭМЫ: «ЛЕБЕДЗІ»

Вядомая дакументалістка Галіна Адамовіч зрабіла «сапраўдны» дакументальны фільм аб працы хуткай дапамогі. Ён называецца «Лебедзі», ад пазыўнога, якім карыстаюцца супрацоўнікі светлагорскай «хуткай», і паказвае, што ў некаторых прафесій асяроддзе ў большасці сваёй непрыгожае, бруднае і хворае.



Рэжысёр правяла са сваімі героямі пэўны час і зафіксавала, як тут прымаюць званкі, выязджаюць па выкліках і ў якіх дамах у выніку аказваюцца, паказала гумар работнікаў, іх свабодныя хвіліны і паводзіны пацыентаў. «Упрыгожыла» сумнеўнай прыемнасці карцінку рытмічнымі саўндтрэкамі.




Менавіта надзвычайнай фактурай, якая выклікае то агіду, то смех, то жаль, то яшчэ бог ведае што, карціна і каштоўная, бо асаблівай аўтарскай апрацоўкай яна не вызначаецца. З пункту гледжання візуалу гэта адзін з самых багатых і, дарэчы, смелых дакументальных фільмаў кінастудыі апошняга часу.

З ім ты бачыш, якім бывае жыццё, у якіх умовах жывуць людзі і з якіх прычын яны хворыя — а хворыя яны часта праз саміх сябе. Нецэнзурная лексіка, п'яныя пацыенты, запушчаныя дамы і дрэнна забяспечаная хуткая, што мусіць выратоўваць людзей ад цяжкага пахмелля, — усё гэта недзе побач, хоць заўважным можа быць толькі на кінаэкране.



### ПРЫЕМНЫ ЛІКБЕЗ

У пэўным сэнсе фільмы «УНОВИС» і «Вялікае падарожжа князя Мікалая Хрыстафора Радзівіла Сіроткі», зробленыя ў тэлевізійным фармаце і закліканыя даваць гледачам новыя веды, сталі найлепшым кінапрадуктам «Летапіса» за мінулы сезон. Бо цалкам адпавядаюць сваёй катэгорыі і сваім функцыям. Калі на аўтарскай дакументалістыцы, назавём гэта так, відавочна адлюстроўваецца абмежаванасць у часе (магчыма, не толькі ў часе), то больш зразумелыя каноны тэлевізійных даследчыцкіх праектаў дазваляюць ім трапляць у яблычак без асаблівых прэтэнзій на высокае мастацтва.



Першы з названых праектаў, зняты Яўгенам Сяцько, візуалізаваў Віцебск 1920-х, калі сюды прыехаў Казімір Малевіч і стварыў суполку сцвярджальнікаў новага мастацтва УНОВИС. Уласна тую суполку, з якой пачынаўся супрэматызм і ўплыў Малевіча на сусветнае мастацтва. З акцёрамі, каментарыямі мастацтвазнаўцаў, наведваннем музеяў і галерэй фільм прасачыў за падзеямі стагадовай даўніны і сцвердзіў, што Віцебск з'яўляецца радзімай супрэматызму.

У фільме «Вялікае падарожжа князя Мікалая Хрыстафора Радзівіла Сіроткі» Юрыя Цімафеева можна ўбачыць у звычайным жыцці не самае даступнае відовішча — адкрыццё грабніц з радзівілаўскай крыпты касцёла Божага цела ў Нясвіжы. Унікальная для Беларусі традыцыя пахавання пачалася ў XVI стагоддзі з дазволу Папы Рымскага, якога папрасіў Мікалай Радзівіл Сіротка. Князь здзейсніў паломніцтва ў Егіпет, вандраваў па Еўропе і прывёз на беларускую зямлю нешта новенькае, што ўжо ў нашым стагоддзі хавае шмат патаемнага і прывабнага.

Здымачная група прайшла па слядах князевай вандроўкі і паказала грабніцу — у ёй знаходзіцца 72 саркафагі — ва ўсёй паўнаце, ад XVI стагоддзя да сучасных даследаванняў.



Паказальна, што два фільмы па 52 хвіліны (самы вялікі для дакументалістаў кінастудыі хронаметраж) расказваюць пра тую высокую культуру, якая нараджалася на нашай тэрыторыі і якой нам сёння нярэдка не хапае.

### «СВАЕ» ТЭМЫ: «ПОЛАЦКІ ВАЛЬС»

Вольга Дашук, у сваю чаргу, знайшла вельмі сімпатычнага героя — Васіля Граноўскага, што жыве ў вёсцы на Полаччыне, іграе на баяне, праводзіць масавыя мерапрыемствы, складае песні і з'яўляецца кіраўніком народнага хору. Саўндтрэкам да фільма «Полацкі вальс» стала адна з кампазіцый аўтарства Васіля, які сам яе з мясцовым акцэнтам і выконвае.

Карціна сабрала сімпатычныя эпізоды і сканцэнтравалася на творчым жыцці правінцыі: Васіль у запале перарабляе чужы тэкст, які мусіць стаць гімнам прадпрыемства, прыходзіць да сваіх спявачак, што заводзяць песні пад яго баян, фліртуе з суседкай, разважае пра асабістае жыццё, разам з хорам едзе на выступленне.

Фільм, без прэтэнзій на нейкую жыццёвую праўду ці кінаэфекты, поўны правінцыйнай чароўнасці і непатрабавальнасці свайго героя. Нарэшце вёска на вялікім экране не проста не знікае, але і жыве поўным творчым жыццём, дзе ёсць месца сямейным драмам, «гастролям», івэнтам, кампазітарству і песням.

Водгаласы бурных дзён некалі шматтысячных беларускіх паселішчаў захоўваюцца ў спевах вясёлых і дзёрзкіх бабулек і гуках Васілёва баяна. А сам Васіль — сапраўдны герой, поўны нечаканых рухаў, жартаў і выразаў твару.



### «СВАЕ» ТЭМЫ: «ШАХЦЁРЫ»

Яшчэ адну цяжкую і, дарэчы, небяспечную працу, пра якую мы мала ведаем, паказвае Віктар Аслюк, што са здымачнай групай паехаў да шахцёраў на «Беларуськалій» і знайшоў сярод іх герояў свайго фільма «Шахцёры» — бацьку і сына, якія праводзяць пад зямлёй ледзь не большую частку жыцця.

Тут прастору заняла цемра падзямелля, прыгожы пераліў пароды і сучасны спосаб здабычы калію. Своеасаблівая эстэтыка шырокіх праездаў — так, цяпер тут перамяшчаецца буйнагабарытная тэхніка, а не шахцёры з кіркамі — пад манатонныя гукі механізмаў склалася ў пэўны цыкл вытворчасці. Пакуль гледачу літаральна расказваецца, як тут усё адбываецца, можна адключыцца ад сэнсаў асобных эпізодаў, бо рытм апавядання, цыклічнасць, тусклае асвятленне становяцца своеасаблівай кінаформай, што перадае механізаванасць працэсу і халоднасць машынерыі. Нешта падобнае было зроблена ў канадскім фільме Дэні Катэ «Гэта радасць была дасканалай».

Пакуль гэта машынерыя пануе над чалавекам, прыходзяць лагічны ў структуры стужкі канец працоўнага дня, калі шахцёры мыюць рукі перад сыходам, і мы бачым, якімі кустарнымі спосабамі супрацоўнікі вымушаны прыстасоўвацца да звычайных бытавых рэчаў. Тут пануе машынерыя, а тыя, хто ў гэтым падзямеллі, проста выконваюць функцыі...

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

❍ **Тым часам**

### Карэспандэнт «Звязды» працуе на Берлінале

7 лютага ў Берліне распачаўся 69 Міжнародны берлінскі кінафестываль, адзін з найгалоўнейшых кінафорумаў свету. Міжнароднае журы, якое прысуджае «Залатога мядзведзя» і «Сярэбраных мядзведзяў» (некалькі) сёлета ўзначальвае французская актрыса Жульет Бінош, вядомая па ролях у фільмах Кшыштафа Кесьлёўскага, Міхаэля Ханэке, Абаса Кіарастамі, Клер Дэні, Аліўе Асаяса ды іншых аўтараў.

У дні фестывалю, з 7 да 14 лютага, у Берліне маюць адбыцца прэм'еры новых фільмаў Агнешкі Холанд, Чжана Імоу, Франсуа Азона, Фаціха Акіна, Дэні Катэ, Андрэ Цешынэ, якія ўдзельнічаюць у асноўнай конкурснай праграме, што складаецца з 23 фільмаў.

Апроч асноўнага конкурсу фестываль паказвае конкурсныя секцыі «Панарама», «Форум», «Рэтраспектыва» і іншыя.

Падзеі і праграма Берлінале ў пэўным сэнсе фарміруюць будучыя арыенціры сусветнага кінематографа, новыя пазіцыі ў нацыянальных пракатах (у тым ліку беларускім) і перавагі фестывальных адборшчыкаў.

За тым, што будзе адбывацца і паказвацца на Берлінале, «Звязда» прасочыць уласнымі вачыма.

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 18 |

**Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом). Месторасположение: Минская обл., Червенский р-н, Смиловичский с/с, д. Старино**

**Производственная база: цех деревообработки с административными помещениями** (615/С-35497, 1027,1 кв. м), в т. ч. вент. камеры 2 шт., рампа 2 шт., сети питьев. водопровода 184,7 м; сети быт. (255,7 м) и ливн. (287,4 м) канализации, очистные сооружения, двухкамер. септик, поля фильтрации 235 м, покрытия 6446 кв. м; **склад** (615/С-35853, 150,6 кв. м); **КПП** (615/С-35856, 7,6 кв. м), в т. ч. ограждение 639,7 м; **ТП** (615/С-245, 68,3 кв. м); **водозаборная скважина** 615/С-35855), в т. ч. насос Grundfos;
**насосная станция** (615/С-35496, 25,2 кв. м), в т. ч. 2 резервуара 150 куб. м, сети пожар. водопровода 484,3 м; **иное имущество:** сети электроснабжения и оборудование (в соответствии с перечнем, размещенным на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Сведения о земельном участке**: пл. **2,5727 га,** предоставлен на праве аренды по 20.11.2115 для обслуживания цеха деревообработки с административно-быт. помещениями, зданий и сооружений. Ограничения – находится в охран. зонах электрич. сетей свыше 1000 В, пл. 0,2 га

**Начальная цена с НДС – 390 386 руб. 07 коп.** (снижена на 50 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** 60 % от цены продажи имущества, с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачиваются в течение 10 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 6 месяцев

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 05.01.2019**

**Аукцион состоится 12.03.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 11.03.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. **www.cpo.by**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Калинковичский мясокомбинат», Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Северная, 8 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Липовский с/с, аг. Липов, ул. Советская, 26**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Здание комплексного приемного пункта** | 161,4 кв. м | 333/С-24121 |

**Сведения о земельном участке**: пл. **0,0415 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания комплексного приемного пункта

**Начальная цена с НДС 20 % – 3 232,14 бел. руб.** (снижена на 80 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 13.12.2018.

**Аукцион состоится 29.03.2019** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 27.03.2019** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by**. E-mail: auction@cpo.by**

## Да ўвагі акцыянераў Адкрытага акцыянернага таварыства «Сталічны праспект»!

11 сакавіка 2019 года адбудзецца чарговы агульны сход акцыянераў ААТ «Сталічны праспект» (г. Жабінка, вул. Камарова, 6, каб. 3)

Парадак дня:

1. Аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці ААТ «Сталічны праспект» у 2018 годзе і асноўных накірунках дзейнасці Таварыства на 2019 год.
2. Справаздача Назіральнай рады ААТ «Сталічны праспект» за 2018 год.
3. Справаздача рэвізійнай камісіі аб выніках праведзенай рэвізіі за 2018 год і заключэнне па бухгалтарскаму балансу, справаздачы аб прыбытках і стратах, гадавой справаздачы ААТ «Сталічны праспект». Азнаямленне Таварыства с заключэннем аўдытараў.
4. Зацвярджэнне гадавых справаздач, бухгалтарскага баланса, справаздачы аб прыбытках і стратах за 2018 год.
5. Зацвярджэнне размеркавання чыстага прыбытку за 2018 год. Аб выплаце дывідэндаў за 2018 год.
6. Аб накірунках выкарыстання чыстага прыбытку ААТ «Сталічны праспект» на 2019 год.
7. Выбары членаў назіральнай рады і членаў рэвізійнай камісіі ААТ «Сталічны праспект».
8. Аб прызначэнні матэрыяльнай узнагароды членам назіральнай рады і рэвізійнай камісіі.

Форма правядзення сходу – вочная.

Месца правядзення сходу – г. Жабінка, пасёлак Цукровага завода, клуб ААТ «Жабінкаўскі цукровы завод».

Пачатак работы сходу: 11 сакавіка 2019 года ў 12.45.

Рэгістрацыя асоб, якія маюць права на ўдзел у сходзе, ажыццяўляецца ў дзень правядзення сходу па месцы правядзення сходу пры ўмове прад'яўлення акцыянерамі (іх прадстаўнікамі) дакументаў, якія пацвярджаюць іх паўнамоцтвы (акцыянеру – пашпарт, прадстаўніку акцыянера – пашпарт і даверанасць, завераная у парадку, устаноўленым заканадаўствам). Час пачатку рэгістрацыі: 12.30. Час завяршэння рэгістрацыі: 12.45.

З матэрыяламі сходу можна азнаёміцца з 11 лютага 2019 года па 7 сакавіка 2019 года ў працоўныя дні з 9 да 16 гадзін па адрасе: г. Жабінка, вул. Камарова, 6, каб. 3, а ў дзень правядзення сходу – па месцы правядзення сходу.

УНП 290984478

## ОАО «Крупский плодоовощной завод» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона

**Таблица № 1 – Лот № 1**

Капитальное строение с инвентарным № 613/С-10556, расположенное по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки-2, площадь – 1 598,1 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание хранилища техники

Земельный участок площадью 5,6931 га с кадастровым номером 623050100001002292. Целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания хранилища техники. Право аренды – по 01.10.2102. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

В отношении вышеуказанного имущества проводятся шестые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 15.01.2019 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 60 %. Окончание приема заявлений в 16.00 25.02.2019

**Начальная цена Лота с НДС 20 %** 50 880,00 белорусских рублей

**Таблица № 2**

| № лота | Наименование лота | Начальная стоимость с НДС 20 % | № лота | Наименование лота | Начальная стоимость с НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | капитальное строение с инв. № 613/С-10558 (здание склада-арочника № 1), площадь 490 кв. м | 29 232,00 | 10 | капитальное строение с инв. № 613/С-13482 (погреб), площадь 47,4 кв. м | 2 436,00 |
| 2 | капитальное строение с инв. № 613/С-10559 (здание склада-арочника № 2), площадь 490 кв. м | 29 232,00 | 11 | капитальное строение с инв. № 613/С-13484 (гараж на 4 бокса), площадь 119,5 кв. м | 6 804,00 |
| 3 | капитальное строение с инв. № 613/С-13481 (здание кисельного и горчичного цеха), площадь 813,6 кв. м | 46 032,00 | 12 | капитальное строение с инв. № 613/С-13483 (гараж на 2 бокса), площадь 46,2 кв. м | 2 772,00 |
| 4 | капитальное строение с инв. № 613/С-13480 (проходная), площадь 54,1 кв. м | 11 760,00 | 13 | капитальное строение с инв. № 613/С-13560 (водонапорная башня), площадь 35,3 кв. м | 3 024,00 |
| 5 | капитальное строение с инв. № 613/С-13527 (здание цеха безалкогольных напитков), площадь 416,2 кв. м | 36 876,00 | 14 | капитальное строение с инв. № 613/С-13478 (здания мастерских), площадь 169,8 кв. м | 10 752,00 |
| 6 | капитальное строение с инв. № 613/С-13528 (здание цеха по переработке яблок), площадь 249,2 кв. м | 14 868,00 | 15 | капитальное строение с инв. № 613/С-13479 (спиртохранилище), площадь 104,4 кв. м | 6 636,00 |
| 7 | капитальное строение с инв. № 613/С-13526 (здание цеха для брожения вина), площадь 157,7 кв. м | 14 196,00 | 16 | капитальное строение с инв. № 613/С-10557 (здание склада материальных ценностей), площадь 250 кв. м | 7 476,00 |
| 8 | капитальное строение с инв. № 613/С-13477 (производственный корпус), площадь 201,6 кв. м | 17 892,00 | 17 | сооружение с инв. № 450201 (забор ж/бетонный) | 462,00 |
| 9 | капитальное строение с инв. № 613/С-13485 (котельная), площадь 199,9 кв. м | 21 588,00 | 18 | капитальное строение с инв. № 613/С-13559 (артезианская скважина) | 4 032,00 |

*В отношении имущества в таблице № 2 проводятся третьи повторные торги. Лоты расположены на земельном участке с кадастровым номером № 623050100001002242 по адресу: г. Крупки, ул. Московская, 1. Земельный участок предоставлен для обслуживания зданий и сооружений производственной базы на праве аренды до 2102 года.*
*Публикация об аукционе ранее размещалась 15.01.2019 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 30 %. Окончание приема заявлений в 16.00 25.02.2019*

| | |
|---|---|
| Задаток | 10 % от начальной стоимости предмета торгов |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной стоимости предмета торгов |
| Организатор торгов | ООО «Фрондера», +375 29 395 30 88 |
| Информация о продавце | ОАО «Крупский плодоовощной завод», Минская область, г. Крупки, ул. Московская, д. 1 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант») |
| Дата и время проведения торгов | **26 февраля 2019 года в 12.00 (регистрация с 11.40 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121 |

Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121

| | |
|---|---|
| Условия для участия в торгах | 1. До подачи заявления внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах.<br>2. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah<br>3. Лица, желающие принять участие в аукционе, и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона и возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5 % от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету). Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 10 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи.<br>4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.<br>5. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов – Екатерина, тел. +375 26 395 30 88 |

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды сроком на 3 (три) года имущества, принадлежащего ОАО «Пуховичинефтепродукт»

**Лот № 1**. Право заключения договора аренды Объекта: 1. ПТО для ремонта легковых автомобилей с инв. № 602/С-13982. Адрес: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Октябрьская, 60/1. Площадь – 159,9 кв. м. 2. Асфальтобетонное покрытие (прилегающая к зданию с инв. № 602/С-13982 территория) с инв. № 2612. Площадь – 232,0 кв. м.

**Начальная цена** с НДС – 1 578,38 бел.руб. **Задаток** – 157,84 бел.руб. **Шаг аукциона** – 5 %. **Размер ежемесячной арендной платы**: за здание с инв. № 602/С-13982 – 0,24 базовой арендной величины за 1 кв. м; за асфальтобетонное покрытие – 0,1 базовой арендной величины за 1 кв. м; за оборудование – 103,26 бел. руб.

**Условия аукциона:** 1. Заключить с Продавцом договор аренды Объекта в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.
2. Оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе лота в течение 5 (пяти) банковских дней со дня подписания протокола аукциона на основании счета-фактуры.
3. Оплатить Организатору аукциона стоимость услуги Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. Целевое назначение – Организация пункта технического обслуживания по ремонту и техническому обслуживанию легковых автомобилей.
5. Одновременно с договором аренды Объекта подлежит заключению договор аренды оборудования. Перечень сдаваемого в аренду оборудования содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. №150. Базовая арендная величина с 01.04.2018 равна 16 руб. 11 коп.

Размер штрафа в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 составляет 1 000,00 бел. руб

**Аукцион состоится 12.03.2019 в 11.00 по адресу:** г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже Лота № 1, принадлежащего ОАО «Пуховичинефтепродукт», проводимом 12.03.2019. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 07.03.2019 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Курленко Иван Семенович, тел. +375 17 13-34-8-71

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (микрорайоны «Барановичи-5, 6», «Зарица-4») 12 марта 2019 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-221* | микрорайон «Барановичи-5, 6» | 0,0964 | 440100000003006418 | 3 290,77 | 15 590,33 | 3 100 |
| 2 | Земельный участок У-1551* | микрорайон «Зарица-4» | 0,1053 | 440100000003004595 | 73,50 | 16 369,65 | 3 300 |

*Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельный участок имеет ограничения.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 12 марта 2019 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594 получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению;

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403 с 11 февраля по 6 марта 2019 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 37, 74 20 95, 72 05 46, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by**

Космас

# САМЫ ДАЛЁКІ Ў СОНЕЧНАЙ СІСТЭМЕ

## Чаго вы не ведалі пра Плутон

**Што вы памятаеце пра Плутон са школьнага курса астраноміі? Што гэта маленечкая далёкая ад Сонца планета? Гэты хлопец хоць і невялікі, але вельмі характэрны і заслугоўвае, каб вы даведаліся пра яго крыху больш.**



Плутон
і яго спадарожнік Харон.

### Хто ён

Плутон — дзявятая, карлікавая, самая маленькая планета Сонечнай сістэмы. Дыяметр — 2390 км, што складае 70 % ад Месяца або 18 % ад зямнога паказчыка. Аб'ём — 6,39 х 109 км³. Здаецца, што шмат, але гэта толькі 0,59 % ад зямнога. Па аб'ёме ўнутры Зямлі можна было б размясціць 170 плутонаў. Маса — 1,3 х 1022 кг (0,2 % ад зямной ці 18 % ад месяцавай).

### Назву прыдумала дзяўчынка

Калі ў 1930 годзе навукоўцы адкрылі Плутон, яны наладзілі конкурс на самую лепшую назву для новай планеты. Прапановы паступалі з усяго свету. Адзінаццацігадовая Венецыя Берні з Оксфарда вырашыла, што для цёмнай далёкай планеты падыдзе імя бога падземнага свету са старажытнагрэчаскай міфалогіі — Плутон.

У абсерваторыі Лоўэла прайшло галасаванне за адну з трох назваў: Плутон, Мінерва, Хронас (назва была прапанавана адным з астраномаў). Венецыя Берні атрымала 5 фунтаў стэрлінгаў за сваю перамогу, што на цяперашнія грошы складае прыкладна 300 фунтаў (каля 850 рублёў).

### Манаграма

Астранамічны сімвал Плутона — PL — першыя літары назвы планеты і ініцыялы астранома Персіваля Лоўэла, які прадказаў існаванне карліка ў знешніх межах Сонечнай сістэмы з-за гравітацыйнага ўплыву на Нептун і Уран. Абсерваторыя Лоўэла таксама названая ў гонар навукоўца.

### Паніжэнне ў статусе

Плутон меў статус планеты 76 гадоў. Але ў 2005 годзе навукоўцы адкрылі Эрыс, якая на 27 % цяжэйшая за Плутон, нягледзячы на тое, што ён большы па аб'ёме. Адкрыццё Эрыс прымусіла астраномаў перагледзець умовы, пры выкананні якіх нябеснаму целу прысвойваўся статус планеты, і ў 2006 годзе Плутон быў паніжаны ў статусе і афіцыйна стаў карлікавай планетай № 134340. У сувязі з гэтай падзеяй Амерыканскае дыялекталагічнае таварыства назвала дзеяслоў «аплутоніць» новым словам года. «Аплутоніць» стала азначаць панізіць каго-небудзь ці што-небудзь у званні або каштоўнасці.

Але летась астраномы ўніверсітэта Цэнтральнай Фларыды (ЗША) прыйшлі да высновы, што новае азначэнне тэрміна «планета», пад якое не трапіў Плутон, з'яўляецца памылковым. Былая «дзявятая» планета валодае падземным акіянам і шматслаёвай атмасферай, што робіць яе амаль такой жа складанай у геалагічным плане, як і Зямля. Увогуле, цяпер Плутон зноў мае права называцца планетай. Вось такія астранамічныя страсці.

### Спадарожнікі, атмасфера, арбіта

У Плутона пяць спадарожнікаў, дыяметр Харона — самага вялікага з іх — каля паловы дыяметра Плутона, таму іх часта разглядаюць як бінарную сістэму, таму што іх арбіты ўзаемадзейнічаюць. Іншыя спадарожнікі меншыя, іх назвы: Стыкс, Нікс, Кербер і Гідра.

У Плутона адваротны напрамак кручэння, як у Венеры і Урана. Гэта азначае, што ён круціцца ў процілеглы ад Зямлі бок: Сонца ўстае на захадзе і заходзіць на ўсходзе. Поўны абарот Плутон робіць прыкладна за тыдзень. Арбіта Плутона вельмі эксцэнтрычная, таму часам ён аказваецца бліжэй да Сонца, чым Нептун. Апошні раз Плутон знаходзіўся «ўнутры» арбіты Нептуна ў 1999 годзе.

Плутон — адзіная вядомая планета з атмасферай з азоту, метану і монааксіду вугляроду. Яна таксічная для людзей і змяняецца ў залежнасці ад таго, наколькі блізкі Плутон да Сонца. Калі ён бліжэй за ўсё да Сонца (знаходзіцца ў перыгеліі), атмасфера становіцца газам, а пры максімальным аддаленні (у афеліі) — ператвараецца ў снег і асядае на паверхні планеты.

### Замёрзлы акіян

На Плутоне ёсць падземны акіян з замёрзлай вадой. Яго глыбіня — ад 100 да 180 кіламетраў. Гэта азначае, што на карліку вады ў тры разы больш, чым на Зямлі. Астатнія 2/3 планеты складаюцца з цвёрдых горных парод і замарожанага азоту.

### Да Сонца далёка

Сонечныя прамяні дасягаюць паверхні Плутона за 5,5 гадзіны. Для параўнання: да Зямлі яны далятаюць за 8 хвілін. Адбываецца так таму, што Плутон знаходзіцца на адлегласці 5,9 мільярда кіламетраў ад Сонца, а Зямля — 149,6 мільёна кіламетраў.

### Першаадкрывальнік паляцеў у космас

Клайд Томба, які адкрыў Плутон, стаў першым чалавекам, які здзейсніў міжзоркавае падарожжа пасля смерці. Яго прах быў змешчаны ў аўтаматычную міжпланетную станцыю НАСА «Новыя гарызонты», якая адправілася да Плутона ў 2006 годзе. Нядаўна станцыя праляцела міма Плутона і даслала неверагодныя фатаграфіі на Зямлю. Далей праз Пояс Койпера яна адправіцца ў міжгалактычную прастору ў надзеі выявіць жыццё за межамі Сонечнай сістэмы. На капсуле з прахам Томба высечаны надпіс: «Тут пахаваны Клайд Уільям Томба, першаадкрывальнік Плутона і трэцяй зоны Сонечнай сістэмы. Сын Адэль і Мерон, муж Патрысіі, бацька Анет і Олдэна. Астраном, настаўнік, жартаўнік і сябар. 1906—1997».

Навукоўцы раяць

# ПРОСТЫ СПОСАБ ЗАПАМІНАЦЬ

**Што рабіць, калі часта ўзнікаюць цяжкасці з запамінаннем нават самых простых рэчаў, не кажучы ўжо пра тое, каб вызубрыць параграф з падручніка ці не надта вялікі верш? Не бяда: згодна з новым даследаваннем, самы эфектыўны спосаб запомніць што заўгодна — гэта... малюнак. На практыцы ён аказаўся нават больш эфектыўны, чым запіс тэксту, прагляд відэароліка і іншыя метады візуалізацыі.**

Даследчыкі сцвярджаюць, што пажылыя людзі, якія займаюцца маляваннем, могуць не проста захаваць, але і палепшыць сваю памяць пасля цяжкіх захворванняў, а таксама ў якасці прафілактыкі рызыкі развіцця такіх захворванняў, як дэменцыя і хвароба Альцгеймера.

У каманды Універсітэта Ватэрлоа добрыя навіны для тых, у каго заўсёды былі двойкі па маляванні ў школе: вам зусім неабавязкова маляваць добра. Сам факт таго, што вы малюеце ці адлюстроўваеце неабходную інфармацыю ў выглядзе простых, схематычных малюнкаў ужо адыгрывае вялікую ролю.

Для даследавання былі адабраны 48 удзельнікаў — палова ва ўзросце прыкладна 20 гадоў, а другая палова прыкладна 80 гадоў — якіх папрасілі прайсці серыю практыкаванняў. Калі ім паказвалі паслядоўнасць слоў, яны павінны былі ці напісаць іх, ці паспрабаваць адлюстраваць. Пасля перапынку добраахвотнікаў папрасілі запомніць як мага больш слоў. Вядома, моладзь справілася з заданнем лепш за пажылых людзей, але вось што цікава: абедзве групы ў выніку запомнілі нашмат больш тых слоў, якія яны адлюстравалі на малюнку, а не запісалі тэкстам.



Чаму так адбываецца? У даследчыкаў ёсць здагадка, што эфектыўнасць малявання крыецца ў некалькіх спосабах падачы адной і той жа інфармацыі: візуальнай, прасторавай, моўнай, семантычнай (г. зн. захоўваецца значэнне слова) і маторнай (сам фізічны акт малявання). Такім чынам, большая частка мозга застаецца актыўнай і ўдзельнічае ў захаванні канкрэтнай інфармацыі.

Наступны раз, калі зберацеся на экзамен або будзеце рыхтавацца да важнага выступлення — паспрабуйце рабіць замалёўкі, а не проста раз за разам перачытваць тэкст.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Тэхналогіі

# МАШЫНА, ЯКАЯ ЗАМЕНІЦЬ ХАТНЮЮ ГАСПАДЫНЮ

**Хатнія робаты ўжо не ў навіну для спажывецкага рынку. Вось толькі новая распрацоўка, якая змагла паказаць усяму свету, як сапраўды трэба рабіць падобныя прылады і якім павінен быць іх функцыянал, каб гэтыя прылады сапраўды былі карысныя.**

Хатнія робаты — гэта менавіта тое, з чаго ўжо сёння пачынаецца рэальнае «паўстанне машын». Зрэшты, наўрад ці такія апараты збіраюцца захопліваць свет. Ва ўсякім разе, дакладна не робат Keecker. Упершыню прыладу паказалі яшчэ ў 2014 годзе ў Лас-Вегасе на выстаўцы бытавой электронікі, яшчэ ў выглядзе канцэпту. І вось зараз хатні робат цалкам гатовы і выходзіць на рынак. Цікава, што гэты вычварны малы ўмее рабіць?



Слоган праекта кажа пра тое, што Keecker — гэта больш, чым робат, гэта сапраўдны член сям'і. Нягледзячы на тое, што гэтыя словы не больш, чым маркетынгавы ход, яны на самай справе адлюстроўваюць усю сутнасць праекта. Пакуль адны робаты ўмеюць прыбіраць падлогу, іншыя сачыць за домам, а трэція падстрыгаць газон, Keecker узвальвае на свае плечы цяжкую задачу: ён бярэцца рабіць амаль усё гэта і адразу, ну можа быць, акрамя стрыжкі газона.

У першую чаргу робат з'яўляецца перасоўным мультымедыйным праектарам, які заменіць любы экран, тэлевізар і манітор у доме. Усе яны больш не патрэбныя, таму што Keecker транслюе карцінку ў найвышэйшай якасці, з велізарнай дыяганаллю і на любую паверхню, у тым ліку на сцены і столь.

Акрамя гэтага робат можа свяціць магутным LED-ліхтаром на 1000 люменаў. Як верны сабака ён можа «хадзіць» па доме за гаспадаром, чакаючы адпаведных распараджэнняў пры дапамозе галасавых камандаў або камандаў з мабільных прылад. Робат можа працаваць у якасці сховішча даных, падключаючыся да сеткі Wi-Fi, ён умее распазнаваць твары і адрозніваць чужых ад сваіх. Машына будзе паведамляць свайму карыстальніку пра ўсе дзіўнасці ў доме, будучь



гэта злодзеі, адкрытае акно, разбітая катом ваза, падазроны шум, пажар, паводка або любое іншае падобнае здарэнне.

Робат самастойна перасоўваецца па доме, умее сам наведваць пляцоўку для папаўнення акумулятара і самае галоўнае — працуе будзільнікам для ўсіх членаў сям'і! Абуджаць машына дзяцей і дарослых будзе толькі пад іх любімыя мелодыі.

# КРАЙ ВУЛКАНАЎ

## Што адбываецца ў Сальвадоры?



**37-гадовы Наіб Букеле атрымаў пераканаўчую перамогу на прэзідэнцкіх выбарах у Сальвадоры, набраўшы амаль 54 працэнты галасоў. «Сёння мы ствараем гісторыю», — заявіў малады палітык яшчэ да афіцыйнага абвяшчэння вынікаў. Букеле меў рацыю, паколькі стаў першым пасля заканчэння ў 1992 годзе грамадзянскай вайны кіраўніком гэтай дзяржавы, які не з'яўляецца прадстаўніком адной з дзвюх найбуйнейшых партый. За яго канкурэнта з правага Нацыянальна-рэспубліканскага альянсу Карласа Калеху аддалі свае галасы 31,6 працэнта выбаршчыкаў, а за Уга Марцінэса, прадстаўніка левага Фронту нацыянальнага вызвалення імя Фарабунда Марці, — 13,7 працэнта. Новы прэзідэнт атрымаў перамогу пад лозунгам барацьбы з карупцыяй і аднаўлення парадку на вуліцах краіны з высокім узроўнем злачыннасці. У гэтым яму, сярод іншага, дапамагла досыць паспяховая дзейнасць на пасадзе мэра сальвадорскай сталіцы, а таксама ўменне працаваць з сацыяльнымі сеткамі. Куды рушыць цэнтральнаамерыканская краіна?**

### ВАДА ЗА ЗОЛАТА

Сальвадор нярэдка называюць «краем вулканаў». Асноўная частка яго тэрыторыі ўяўляе сабой нагор'е вышынёй 600—700 метраў над узроўнем мора. Над ім уздымаюцца два паралельныя ланцугі вулканаў. Паўночны, больш нізкі, складаецца з патухлых вулканаў, а паўднёвы — з дзеючых. Самы высокі з іх — Санта-Ана (на захадзе краіны) дасягае вышыні амаль 2,4 кіламетра. Вулкан Ісалька, які амаль бесперапынна дзейнічае з XVIII стагоддзя, нярэдка называюць «маяком Сальвадора»: па начах зарыва над ім відаць з караблёў, якія праходзяць далёка ў акіяне. Частыя вывяржэнні і землетрасенні прычыняюць немалую шкоду насельніцтву і эканоміцы краіны. З іншага боку, попел і лава, якія пакрываюць зямлю нагор'я, спрыяюць значнаму павелічэнню ўраджайнасці. А сельскагаспадарчая прадукцыя цяпер — аснова экспарту краіны.

Да прыходу ў XVI стагоддзі іспанскіх заваёўнікаў тут існавала дзяржава Кускатлан, што перакладаецца з мовы індзейцаў-науа як «зямля каштоўных камянёў». І гэта сапраўды так — у нетрах Сальвадора шмат карысных выкапняў. Даказаны запасы жалеза, медзі, цынку, свінцу, серабра, золата, плаціны, ртуці, баксіту, серы, азбесту, кааліну, кварцу, гіпсу, вапняку. Ёсць таксама граніт і мармур. Аднак распрацоўка гэтых прыродных запасаў больш не праводзіцца. Сальвадор, які з'яўляецца самай маленькай дзяржавай Цэнтральнай Амерыкі, першым у свеце ўвёў поўную забарону на здабычу рудных карысных выкапняў, каб не дапусціць забруджвання і змяншэння запасаў пітной вады. Заходнія кампаніі доўгі час рваліся перш за ўсё да радовішчаў золата на поўначы краіны, падраздзяленне канадска-аўстралійскай Oceana Gold нават падавала іск у Міжнародны цэнтр па ўрэгуляванні інвестыцыйных спрэчак (ICSID) — арбітражную ўстанову групы Сусветнага банка, паведаміла Financial Times. Заканадаўчая асамблея Сальвадора прыняла закон, які пертварыў маратарый на распрацоўку ў пажыццёвую забарону, большасцю ў 69 галасоў з 84. У падтрымку гэтай ініцыятывы выступалі службовыя асобы і навукоўцы, прафесійныя лабісты і каталіцкая царква. Пры гэтым закон не закранае здабычу вугалю, солі, работу каменяломняў.

Узровень забруджвання навакольнага асяроддзя ў Сальвадоры з'яўляецца адным з самых высокіх у рэгіёне (другі пасля Гаіці), а даступнасць пітной вады — самай нізкай, сведчаць даныя ААН. «Горная справа — тая галіна, першай і асноўнай ахвярай якой з'яўляецца вада. У выпадку з Сальвадорам гэта пытанне жыцця і смерці», — сцвярджае эксперт па горнарудней галіне Андрэс Макінлі з Цэнтральнаамерыканскага ўніверсітэта ў Сан-Сальвадоры. Разам з тым, як адзначаюць эканамісты, краіна адчайна мае патрэбу ў новых крыніцах даходаў. Рашыць гэты «рэбус» пакуль не ўдаецца.

### ЧАТЫРНАЦЦАЦЬ СЕМ'ЯЎ

Невялікая рэспубліка (афіцыйная назва краіны — Рэспубліка Эль-Сальвадор) з насельніцтвам каля 6,5 мільёна чалавек доўгі час знаходзілася на адным з першых месцаў у свеце па ўзроўні гвалту. За апошнія некалькі гадоў улады змаглі дамагчыся паляпшэння сітуацыі ў сферы бяспекі, паведаміла ТАСС. Паводле афіцыйных даных, летась у Сальвадоры было здзейснена 3,34 тысячы забойстваў — на 15 працэнтаў менш, чым годам раней. Узровень злачынстваў такога роду склаў 51 выпадак на 100 тысяч жыхароў, што ў два разы менш, чым у 2015-м.

Паводле неафіцыйных даных, у сталіцы Сальвадора штодня ад рук злачынцаў гіне каля дваццаці чалавек. Людзей забіваюць пры рабаванні ці, напрыклад, за супрацоўніцтва з паліцыяй. Дарэчы, мясцовыя вартавыя парадку працуюць толькі ў масках, імкнучыся схаваць асаблівыя прыкметы. Адна з самых вядомых бандаў, якая дзейнічае не толькі ў Сальвадоры, але і іншых краінах, у тым ліку ЗША, — Mara Salvatrucha, што на слэнгу



азначае «брыгада сальвадорскіх бадзяжных мурашак». «Брыгадзіры» з татуіроўкамі па ўсім целе вылучаюцца крайняй жорсткасцю.

Эканоміка краіны знаходзіцца пад кантролем алігархіі — так званых чатырнаццаці сем'яў (хоць на самай справе іх значна больш). Першакрыніцай багацця гэтых сямейных кланаў была кава, але з цягам часу іх дзейнасць набыла больш рознабаковы характар і ўключала інвестыцыі ў апрацоўчую прамысловасць, фінансы, гандаль і розныя галіны сельскай гаспадаркі. Адно з галоўных абяцанняў фаварыта і пераможцы прэзідэнцкай гонкі Наіба Букеле — барацьба з карупцыяй. Што не дзіўна, бо амаль усе палітычныя партыі краіны загразлі ў звязаных з ёй скандалах. З апошніх шасці прэзідэнтаў краіны ў карупцыі былі афіцыйна абвінавачаныя трое. Франсіска Флорэс (займаў пасаду ў 1999—2004 гадах) абвінавачваўся ў тым, што з $15 млн, выдзеленых урадам Тайваня на дапамогу ахвярам землетрасення, ён перавёў $10 млн на рахункі АРЕНА, а $5 млн забраў сабе. Франсіска Флорэс памёр, не дажыўшы да прызначанай даты суда. Яго пераемнік Антоніа Сака (кіраваў краінай у 2004—2009 гадах) летась быў асуджаны за растрату дзяржаўных сродкаў і адмыванне грошай. Ён быў прысуджаны да дзесяці гадоў турмы і павінен вярнуць дзяржаве $260 млн. Экс-прэзідэнт Маўрысіа Фунесу (знаходзіўся ва ўладзе ў 2009—2014 гадах) быў у мінулым годзе аб'яўлены ў міжнародны вышук. Яго разам з групай службовых асоб і сваякоў абвінавачваюць у карупцыйных дзеяннях і нанясенні дзяржаве шкоды на суму $351 млн. Фунесу хаваецца ад правасуддзя ў Нікарагуа. У інтэрв'ю АР, дадзеным на апошнім тыдні перад выбарамі, Наіб Букеле сказаў: «Мы заяўляем гучна і выразна: незалежна ад таго, ці будзе гэта хтонебудзь з нашай партыі ці з іншай партыі, хто заўгодна... мы будзем рабіць захады супраць карупцыянераў».

### БЫЛЫЯ САПЕРНІКІ

Дзве вядучыя палітычныя партыі Сальвадора, былыя сапернікі з часоў грамадзянскай вайны, — Нацыяналістычны рэспубліканскі альянс (ARENA) і «Фронт нацыянальнага вызвалення імя Фарабунда Марці» (FMLN). ARENA пачыналася як палітычнае крыло «батальёнаў смерці», арыентаванае на ЗША. Першапачаткова займала ўльтраправыя пазіцыі, пазней зрушылася крыху налева. FMLN пачыналася як аб'яднанне пяці паўстанцкіх груповак, арыентаванае на СССР, але пасля завяршэння грамадзянскай вайны ў 1992 годзе трансфармаваўся ў левую палітычную партыю. З 1989-га да 2009 года пасаду прэзідэнта краіны займалі прадстаўнікі ARENA, з 2009 па цяперашні час — прадстаўнікі FMLN.

Фронт на гэтых выбарах прадстаўляў 51-гадовы Уга Роджэр Марцінэс Банілья. Пры дзеючым і папярэднім прэзідэнтах ён быў міністрам замежных спраў. Знаходзячыся на гэтай пасадзе, ён займаўся аднаўленнем дыпламатычных адносін з Кубай, некалькі разоў бываў у Расіі.

ARENA выставіла Карласа Калеха — 42-гадовага бізнесмена, уладальніка ступені МВА, атрыманай у Нью-Ёрку. Ён сын аднаго з найбагацейшых жыхароў краіны і займае пасаду віцэ-прэзідэнта ў сямейным бізнесе Grupo Calleja, які дзейнічае ў сферах нерухомасці, фінансавых паслуг, харчовай прамысловасці і рознічнага гандлю. Пад кіраўніцтвам гэтай кампаніі знаходзіцца вялікая частка супермаркетаў найбуйнейшай у краіне сеткі Super Selectos.

Кандыдат Хасэ Альварада прадстаўляў на выбарах новую партыю VAMOS! (яе назва перакладаецца з іспанскай як «Наперад!» ці «Давай!»). Альварада ганарыцца тым, што яго партыя — адзіная ў краіне, якая не мае цёмнага мінулага.

### СЭЛФІ НА ТРЫБУНЕ

Наіб Арманда Букеле Артэс — былы мэр сталіцы Сан-Сальвадора, які карыстаецца велізарнай папулярнасцю сярод моладзі. Яго перамога ўжо ў першым туры прэзідэнцкіх выбараў рантоўна паклала канец амаль 30-гадоваму перыяду, на працягу якога існавала фактычна двухпартыйная сістэма і краінай кіравалі альбо ўльтралевыя, альбо ўльтраправыя лідары, якія супрацьстаялі адзін аднаму. Букеле, як звычайна, у пацёртых джынсах і скуранай куртцы (гэта яго пастаяннае адзенне), пасля таго як мясцовы Цэнтрвыбаркам абвясціў, што ён набраў ужо амаль 54 працэнты галасоў і яго перамога стала бясспрэчнай, адзначаў свой неверагодны поспех разам з тысячамі прыхільнікаў на Морасане — цэнтральнай плошчы Сан-Сальвадора, перадала svoboda.org.

Прэзідэнт, інаўгурацыя якога адбудзецца 1 чэрвеня, — этнічны палесцінец (у Сальвадоры пражывае каля 100 000 этнічных палесцінцаў, у асноўным хрысціян, чые продкі іміігравалі ў краіну ў пачатку ХХ стагоддзя). З 18 гадоў займаецца бізнесам. Паводле даных газеты El Faro, Букеле належыць кампанія, якая займаецца дыстрыбуцыяй тавараў вядомай японскай фірмы Yamaha ў Сальвадоры (кіраўніком кампаніі з'яўляецца яго брат Ібрахім). Таксама ён валодае рэкламным агенцтвам Obermet (намінальным уладальнікам лічыцца яго брат Карым). У 2012 годзе Букеле быў абраны мэрам мястэчка Нуэва-Кускатлан. Па даных газеты El Faro, выручка яго кампаній у той год перавысіла $13 млн. З 2015-га па 2018-ы Букеле кіраваў Сан-Сальвадорам.

У 2017 годзе камісія па этыцы FMLN выключыла яго з партыі. У спісе вылучаных супраць яго абвінавачанняў значыліся парушэнне праграмных дакументаў партыі, раскольніцкія дзеянні, выказванні, якія ганяць годнасць членаў партыі і паўстанцаў, грэбаванне правамі жанчын. Пасля выключэння Наіб Букеле абвясціў сябе незалежным кандыдатам, гэтую заяву ён зрабіў у «Твітэры». Ён увогуле актыўна карыстаецца сацыяльнымі сеткамі. У «Фэйсбуку» на яго падпісаныя 1,45 мільёна чалавек. Пра свой намер балатавацца ў прэзідэнты ён таксама заявіў праз гэтую сацыяльную сетку. Відэаролік паглядзелі больш за мільён чалавек.

Перад выбарамі Букеле спрабаваў зарэгістраваць уласную партыю Nuevas Ideas («Новыя ідэі»), але не паспеў гэта зрабіць. Ён зазнаў скаардынаваны ціск з боку быццам бы непрымірымых праціўнікаў — і левай FMLN, і правага Нацыяналістычнага альянсу. Яму не давалі дзейнічаць і выступаць, пагражалі забойствам і не дапускалі да СМІ. Аднак у рэшце рэшт Букеле знайшоў падтрымку ў дзіўнага з пункту гледжання палітычнай арыентацыі, ідэалогіі і лозунгаў аб'яднання — праваэнтрысцкага крыла кансерватыўна-левацэнтрысцкага Шырокага альянсу за нацыянальнае адзінства (GANA).

Было б няправільна лічыць легкадумнасцю тое, што адразу пасля абвяшчэння вынікаў галасавання ён зняў на мабільны тэлефон сэлфі са сваімі прыхільнікамі, заўважае El País. Гэта добра прадуманая стратэгія, якая прынесла свой плён, яна дазваляе зірнуць на палітыку пад іншым ракурсам. Але, як справядліва заўважае выданне, адна справа выйграць выбары з дапамогай сацыяльных сетак, і зусім іншая — правільна выкарыстоўваць іх пры кіраванні краінай. А праблем у невялічкага Сальвадора, як бачым, багата. Яшчэ адна з іх — эміграцыя. За межамі краіны знаходзяцца, па розных ацэнках, да 3,5 мільёна яе грамадзян. Відавочна, што працяг актыўнай барацьбы са злачыннасцю, развіццё эканомікі і павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва стануць асноўнымі задачамі, якія давядзецца вырашаць будучаму кіраўніку дзяржавы.



**Захар БУРАК.**

# «ДЗЕЦІ ПАЙШЛІ ЗА МНОЙ»



## ПРА ПРЭЗІДЭНТА, КНЫША І КОРБУТ

***— Ірына Робертаўна, успомніце, як даведаліся пра такую прыемную для сябе навіну?***

— У канцы года дырэктар нашай СДЮШАР традыцыйна падводзіў вынікі. Не афіцыйна, не пры ўсіх ён сказаў мне: «Рыхтуйцеся ў Мінск, купляйце новы касцюм, у вас узнагароджванне ў Прэзідэнта». Я спачатку наогул не зразумела, што гэта мне.

Цырымонія ўручэння ў Мінску была вельмі ўрачыстая, было вельмі хвалююча, але я адчула гонар, таму што моцных трэнераў па батуце ў нас у краіне шмат, ёсць з каго выбіраць.

***— Вы марылі пра сустрэчу з Прэзідэнтам?***

— Мне здавалася, што гэта нездзяйсняльна, таму не было такіх думак. Я проста выконваю сваю работу, як усе людзі, тым больш да мяне прыходзяць дзеці. Аляксандр Рыгоравіч кожнаму ўручаў граматы, сказаў кожнаму асобныя словы. Мне было сказана, што ён вельмі ганарыцца нашым відам спорту, Прэзідэнт падзякаваў за алімпійскага чэмпіёна. Наогул, віншаванняў было шмат, яны гучалі ад вучняў, калег, сяброў, знаёмых. Патэлефанавала нават мой першы трэнер, было вельмі прыемна.

***— Колькі гадоў вы прысвяцілі трэнерству?***

— Я пачынала працаваць у сваім відзе спорту, у гімнастыцы. Тады нават не ведала, што ёсць такі від спорту, як скачкі на батуце, ён толькі пачынаў развівацца. Але так атрымалася, што я вучылася з першым майстрам спорту па скачках на батуце ў Гродне і ён жартам або ўсур'ёз сказаў: «Прыходзьце да нас працаваць». Адзін раз сказаў, другі, трэці. І нават не магу растлумачыць чаму, але я пагадзілася. У мяне былі добрыя групы на гімнастыцы, з гэтымі ж групамі я і пайшла на батут. Дзеці пайшлі за мной. Дарэчы, дзіця, якое пайшло за мной, — Вольга Рудая, цяпер яна Вольга Анатолеўна Уласава, галоўны трэнер нацыянальнай зборнай і нашага алімпійскага чэмпіёна Уладзіслава Ганчарова.

***— Што вы бачылі тады ў гэтай маленькай дзяўчынцы?***

— Яна была вельмі працаздольнай, смелай, магла спакойна ў тым узросце прымаць рашэнне, ёй можна было штосьці даручыць, адказная дзяўчынка. Калі была маленькай, паказвала вельмі добрыя вынікі, хутка вучыла новыя элементы, акрамя таго, Воля была з добрым характарам.

***— А самі вы трэніраваліся ў яшчэ больш вядомага спецыяліста — Рэнальда Іванавіча Кныша...***

— Так, а побач займалася Воля Корбут. Рэнальд Іванавіч правадзіў шыкоўныя размінкі, якія мы і цяпер памятаем, ён рабіў вельмі сур'ёзныя, цікавыя агульнафізічныя трэніроўкі. Заўсёды даваў добрыя парады. Калі я прыйшла на батут, працавала па методыцы гімнастыкі, гэта значыць, па методыках Кныша.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Часта вучні Рэнальда Іванавіча казалі аб яго няпростым характары.***

— Любы трэнер са сваімі складанасцямі. Сказаць, што мяне гэта моцна закранула, я не магу, можа быць, таму што сама я была з цяжкім характарам. Нядаўна мы сустракаліся з Рэнальдам Іванавічам, размаўлялі, ён даў шмат каштоўных парад. Расказаў, як трэніраваў, як ён бачыць гэты працэс, успомніў, як рыхтаваў Корбут, і падзяліўся меркаваннем, як бы ён рабіў гэта цяпер. Кныш вельмі добры псіхолаг, большасць яго парад датычылася менавіта дысцыпліны, таго, як ён бачыць дзяцей і сам працэс трэніроўкі, ролю трэнера ў гэтым працэсе. Я паслухала, але для мяне не вельмі прымальныя яго падыходы. Кныш мог вельмі добра паставіць тэхніку, у яго матэматычны склад розуму, і ён мог пралічыць, ці зможа зрабіць Вольга Корбут тую ж пятлю, якую ён прыдумаў менавіта для яе. Рэнальд Іванавіч рабіў вельмі шмат практыкаванняў, якія падводзяць да складаных элементаў. Дарэчы, першыя ямы з паралонам зрабіў менавіта Кныш.

***— А якой тады была Вольга Корбут?***

— Яна была старэйшая за нас, калі я пачынала трэніравацца ў гэтай жа зале. Вольга яшчэ не была такой тытулаванай, але ў яе ўжо былі нейкія вынікі. А яе росквіт прыйшоўся дзесьці на мой 5 клас, Вольга тады прыехала з Алімпіяды. Але мы перадзяваліся ў адной раздзявальні, трэніраваліся ў адной зале, сказаць, што ў яе былі нейкія прывілеі, — не. Корбут таксама выходзіла на паставенне, як усе, яна вельмі добра з намі кантактавала, магла пажартаваць, даць параду.

## МЫ НАВАТ НЕ ХАДЗІЛІ Ў АДПАЧЫНАК

***— У маладосці вы бачылі сябе трэнерам ці хацелі дасягнуць вялікіх вынікаў як спартсменка?***

— Да гэтага часу памятаю, і цяпер, калі сустракаліся з Рэнальдам Іванавічам, успаміналі, ён спытаў у мяне: «Ты хочаш стаць алімпійскай чэмпіёнкай?» Я сказала не, не хачу. Мала, хто з дзяцей так адказвае. Вельмі шмат трэба было трэніравацца, гэта было не па мне, хоць казалі, што ў мяне добрыя даныя. Тады мне не хапіла працавітасці і ўседлівасці, адкуль гэтыя якасці з'явіліся, калі я стала працаваць трэнерам, не ведаю. Мяне ўвесь час трэба было прымушаць, матываваць, сама прыйсці ў залу і трэніравацца я не магла. Ды і трэнерам не збіралася я станавіцца. Калі скончыла тэхнікум фізкультуры, сказала, што ў залу больш не пайду, уладкавалася інструктарам па спорце на гродзенскую фабрыку цацак. Папрацавала паўгода і зразумела, што даросламу насельніцтву спорт наогул не патрэбны. Мне захацелася пайсці назад на гімнастыку,



прыйшла ўладкоўвацца ў ДЮСШ № 3. У залу да Рэнальда Іванавіча пайсці пасаромелася.

***— Зараз маладыя трэнеры кажуць пра маленькую зарплату, у ваш час такія размовы былі?***

— У наш час таксама не многія заставаліся пасля вучобы працаваць трэнерам. Пачынаюцца сямейныя праблемы, таму што трэба ўвесь час ездзіць на спаборніцтвы, у маладосці мы нават не хадзілі ў адпачынак, таму што дзяцей пакідаць нельга, бо праз месяц прыйдзецца ўсё пачынаць спачатку. Вытрымаць гэта маглі не ўсе, трэба было сваіх дзяцей пакідаць на некага. Шмат хто пайшоў туды, дзе было больш зручна.

***— Часта ў мінулым вядомыя спартсмены не хочуць працаваць з маленькімі дзецьмі.***

— А дарэмна, яны павінны праз гэта прайсці, прачуць. Ідэальны варыянт, як Вольга Уласава і Улад, яна яго знайшла, выхавала і вывела на алімп. Я да гэтага часу працую і з маленькімі, і з вялікімі.

Іншая справа, што не ўсе спартсмены могуць стаць добрымі трэнерамі, гэта не ўсім дадзена. І гэта, дарэчы, відаць адразу, ёсць у трэнера задаткі ці не. Каб быў вынік, трэба вельмі шмат часу праводзіць у зале, не проста прыйшоў, адпрацаваў і пайшоў. Перад спаборніцтвамі, можа, і два разы на дзень трэба патрэніраваць, хоць гэта і не аплачваецца.

***— А па дзіцяці за некалькі трэніровак можна сказаць, ці зможа яно вырасці ў спартсмена высокага ўзроўню?***

— Ёсць дзеці, якія вылучаюцца, але не ўсе адораныя дзеці становяцца чэмпіёнамі, таму што таленавітыя, як правіла, вельмі лянівыя. Калі знойдзецца той чалавек, які прымусіць іх працаваць, то з іх нешта будзе. А ёсць дзеці быццам бы з не вельмі добрымі данымі, але сваёй працаздольнасцю яны могуць дасягнуць многага.

## «НІКОЛІ НЕ КАЖУ, ШТО ВАШЫ ДЗЕЦІ БУДУЦЬ ЧЭМПІЁНАМІ»

***— Што вы адчуваеце, калі вучні дасягаюць поспехаў?***

— Спачатку радасць, таму што радуюцца вучні. Радуешся перш за ўсё за іх, за тое, што яны дасягнулі сваіх мэт. Потым спусташэнне і стомленасць, але гэта літаральна адзін дзень, потым прыязджаеш у залу і пачынаеш ставіць новыя элементы, таму што наперадзе стаяць новыя мэты, новыя задачы, спаборніцтвы.

***— Бываюць канфлікты з вучнямі?***

— Сур'ёзных ніколі не было, і з бацькамі таксама, больш рабочыя моманты. Калі ты працуеш з маленькімі дзецьмі, бываюць нейкія прэтэнзіі ў бацькоў, гэта нармальна. Не ўсе дзеці могуць скакаць, я імкнуся растлумачыць гэта, не дацягваць да дарослага ўзросту, прапаную іншы від спорту. І ніколі нікому нічога не абяцаю — ні бацькам, ні дзецям. Ніколі не кажу, што вашы дзеці будуць чэмпіёнамі.

***— У чым заключаецца ваш сакрэт падрыхтоўкі паспяховых спартсменаў (вучні Бараноўскай неаднаразова станавіліся прызёрамі чэмпіянатаў свету і Еўропы)?***

— Трэба вельмі гэтага хацець. Калі я стала старшым трэнерам, пачала хацець, каб мае дзеці былі найлепшымі, важна самой сабе даказаць, што я змагу давесці сваіх спартсменаў да высокага ўзроўню. Ну і, вядома, перш за ўсё трэба любіць сваю працу і яшчэ працаваць, усяго толькі працаваць. *(Усміхаецца.)*

***— Колькі часу вы сёння праводзіце ў зале?***

— Чатыры гадзіны раніцай і чатыры гадзіны вечарам, адзін выхадны ў тыдзень. Сёлета нават у адпачынку была, упершыню за доўгія гады.

***— У чым вы чэрпаеце сілы?***

— Дзеці прымушаюць працаваць, яны ж прыходзяць, значыць, ты павінен ім нешта даць, хочаш гэтага ці не. Калі не, то трэба ўжо не прыходзіць, а ісці на пенсію, спакойна сядзець дома. Часам прыходзіш у залу і думаеш, напэўна, сёння не атрымаецца. А потым глядзіш — у дзяцей гараць вочы, і ты пачынаеш працаваць. Мне цікава, калі ў дзяцей, якія нічога не ўмелі, раптам пачынае атрымлівацца.

***— Быў момант, калі вы хацелі кінуць і больш не прыходзіць у залу?***

— Так, і я ўладкавалася на падпрацоўку ў школу, вытрымала паўгода. Пасля гэтага сысці нават не спрабавала.

***— Чым вы займаецеся звычайна за межамі залы?***

— Люблю ездзіць адпачываць, падарожнічаць, люблю экскурсіі, таму, калі іду ў адпачынак, заўсёды імкнуся куды-небудзь з'ездзіць, нешта паглядзець, не езджу два разы ў адно і тое ж месца. Люблю лазню, люблю вязаць, паколькі сям'і ў мяне няма, дзяцей няма, люблю чытаць, глядзець кіно, нашы выступленні ў інтэрнэце. Калі ідзе адпачываць, не люблю спорт. Усё хачу пачаць займацца ёгай, але час супадае з маімі трэніроўкамі.

***P. S.** Адказваючы на пытанні, Ірына Робертаўна глядзела мне ў вочы, але нейкім чынам у полі яе зроку знаходзіліся і ўсе чатыры батуты ў зале. Яна бачыла, хто з вучняў недакруціў сальта, хто сагнуў ногі і недацягнуў насочкі. Па ходзе гутаркі яна тлумачыла не толькі мне, але і ім, як рабіць правільна, за гадзіну размовы да яе падыходзіла каля дзясятка вучняў, а яна ні разу не падвысіла голасу, як гэта часта можна сустрэць на трэніроўках, і не пакінула без увагі ні аднаго пытання.*

*Мінск — Гродна — Мінск.*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

---

Напярэдадні падзеі

## НОВЫ СЕЗОН — НОВЫЯ ЧАКАННІ

### Сёлета Кубак Федэрацыі разыграюць 57-ы раз

**Жаночыя зборныя Беларусі і Германіі сустрэнуцца 9—10 лютага ў рамках І раўнда Сусветнай групы Кубка Федэрацыі 2019 года, каб паспрачацца за пуцёўку ў паўфінал прэстыжнага сусветнага першынства. Каманды згуляюць у нямецкім Браўншвайгу.**

Капітан зборнай Беларусі Таццяна Пучак выклікала на матч з немкамі самых моцных і вопытных тэнісістак.



У адпаведнасці з рэйтынгам роля лідара беларускай каманды дасталася 9-й ракетцы свету Арыне Сабаленцы. Акрамя яе ў склад трапілі Аляксандра Сасновіч, Вера Лапко і Лідзія Марозава. Таксама прыемна, што ў шэрагі зборнай вярнулася Вікторыя Азаранка, якая не прымала ўдзел у матчах Кубка Федэрацыі з красавіка 2016 года.

Капітан зборнай Германіі Енс Гёрлах уключыў у склад матча супраць беларусак Андрэа Петкавіч, Мона Бартэль, Лауру Зігемунд, Таццяну Марыя і Ганну-Лену Гронефельд. *«У нас вельмі дасведчаная і збалансаваная каманда, якой можна давяраць многае»,* — сказаў капітан зборнай Германіі.

Адзначым, што нямецкія тэнісісткі ўдзельнічаюць у Кубку Федэрацыі з 1963 года, за 57 гадоў яны двойчы ўздымалі над галавой галоўны трафей, стаўшы чэмпіёнкамі ў 1987 і 1992 гадах. У сезоне 2018 года зборная Германіі ў І раўндзе Сусветнай групы на хардзе мінскай «Чыжоўка-Арэны» абыграла Беларусь з лікам 3:2, але ў паўфінале саступіла будучым пераможцам турніру камандзе Чэхіі — 1:4.

Зараз зборная Беларусі займае 3-е месца ў рэйтынгу Кубка Федэрацыі, немкі размясціліся на 5-м радку. Гэта будзе другая сустрэча дзвюх камандаў у рамках сусветнага першынства.

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ОСТРОВ ВЕЗЕНИЯ»

**1. Организатор Рекламной игры**

Общество с ограниченной ответственностью «Ресторан-пивоварня ДРУЗЬЯ», УНП 192135107, зарегистрированное Минским горисполкомом 4 октября 2013 года, регистрационный номер 192135107 (далее – Организатор).

**Место нахождения Организатора**

г. Минск, ул. Кульман, 40, 200100, Республика Беларусь.

**2. Заинтересованное лицо**

Общество с ограниченной ответственностью «Топ–Тур», УНП 100065954 (далее – Заинтересованное лицо).

**Место нахождения Заинтересованного лица**

г. Минск, ул. Я. Коласа, 40, 220013, Республика Беларусь.

**3. Наименование Рекламной игры**

Рекламная игра «Остров Везения» (далее – Рекламная игра).

**4. Территория проведения Рекламной игры**

Объект общественного питания «Ресторан-пивоварня ДРУЗЬЯ» https://texas-chicken.by/texas-chicken-v-mire по адресу: г. Минск, ул. Кульман, д. 40.

**5. Срок начала и окончания Рекламной игры**

• срок начала Рекламной игры – 11 февраля 2019 года,

• срок окончания Рекламной игры – 3 июня 2019 года (включая срок выдачи приза и опубликования результатов проведения Рекламной игры).

**6. Комиссия по проведению Игры**

Организатором сформирована комиссия по проведению Рекламной игры в следующем составе:

Председатель комиссии:

Приемко Юрий Викентьевич, директор ООО «Ресторан-пивоварня ДРУЗЬЯ».

Члены комиссии:

Ермакович Алеся Романовна, заместитель директора по развитию ООО «Ресторан-пивоварня ДРУЗЬЯ»,

Царева Екатерина Игоревна, ведущий специалист по маркетингу ООО «Ресторан-пивоварня ДРУЗЬЯ»,

Мельник Яна Игоревна, ведущий юрисконсульт ООО «Ресторан-пивоварня ДРУЗЬЯ»,

Цурко Сергей Иванович, генеральный директор ООО «Топ Тур»

(далее – Комиссия).

**7. Наименование товаров (работ, услуг), в целях стимулирования реализации которых проводится Игра**

Игра проводится в целях стимулирования реализации продукции собственного производства:

1) Треска в лазурном море;
2) Сковорода мидий в соусе;
3) Карибский шампур из свинины с цукини и сладким перцем;
4) Бизон гриль с печеными овощами;
5) Банановое каноэ с шоколадом и мороженым.

**8. Участники Игры**

К участию в Игре приглашаются совершеннолетние физические лица, заказывающие, приобретающие или использующие товары (работы, услуги) исключительно для личных, семейных, домашних и иных нужд, не связанных с осуществлением предпринимательской деятельности, отвечающие требованиям Правил проведения Рекламной игры и выразившие желание принять участие в Рекламной игре на условиях, предусмотренных в настоящих Правилах (далее – Участник).

Право принять участие в Рекламной игре имеют лица, проживающие или пребывающие на территории Республики Беларусь в период проведения Рекламной игры с учетом ограничений, установленных Правилами и законодательством Республики Беларусь.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**9. Порядок участия в Рекламной игре**

**9.1.** Для участия в Рекламной игре Участнику необходимо в период с 11 февраля до 15.00 9 мая 2019 года выполнить следующие условия:

• При посещении объекта общественного питания «Ресторан-пивоварня ДРУЗЬЯ» https://texas-chicken.by/texas-chicken-v-mire получить у сотрудника Организатора (администратора, официанта) Карту Участника Рекламной игры с перечнем блюд согласно пункту 7 Правил, которые необходимо приобрести для участия в Рекламной игре (далее – Карта Участника).

• За каждый заказ блюда, указанного в пункте 7 Правил, получить отметку в Карте Участника.

• При заказе всех блюд, указанных в пункте 7 Правил, и получения за них соответствующих отметок в Карте Участника, Участнику необходимо указать в Карте Участника следующие данные:

– фамилию, имя, отчество (при наличии) Участника;

– номер мобильного телефона Участника;

– адрес места жительства (места пребывания) Участника.

• Опустить Карту Участника, заполненную в соответствии с настоящим пунктом Правил, в брендированный ящик, расположенный в объекте общественного питания «Ресторан-пивоварня ДРУЗЬЯ».

**9.2.** Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при выполнении условий, необходимых для участия в Рекламной игре согласно пункту 9.1 настоящих Правил.

**9.3.** Организатор не несет ответственности за ошибки, допущенные Участником при заполнении персональных данных в Карте Участника.

**10. Призовой фонд**

Призовой фонд сформирован Заинтересованным лицом в размере 6390,00 (шесть тысяч триста девяносто) белорусских рублей и включает следующий Приз:

| Наименование | Описание | | | | | | | | | Кол-во |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | | | | | | | | | 3 |
| Туристическое путешествие на двоих | Страна | Город | Отель (катег.) | Номер | Питание | Начало тура | Окончание тура | Ночей | Транспорт | 1 шт. |
| | Греция | Остров Тасос | 4* | DBL, Standart, 2 AD | HB | сентябрь 2019 | сентябрь 2019 | 7 | Авиа из Минска + трансфер | |

**11. Порядок проведения розыгрыша призового фонда**

**11.1.** Розыгрыш Приза проводится открыто в присутствии Комиссии 9 мая 2019 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Кульман, д. 40.

В розыгрыше участвуют Карты Участников, заполненные согласно пункту 9 Правил.

**11.2. Порядок определения Победителя:**

Карты Участников помещаются в лототрон в присутствии членов Комиссии по проведению Рекламной игры и перемешиваются.

Для определения Победителя Рекламной игры один член Комиссии раскручивает лототрон и путем случайного выбора определяет Победителя розыгрыша, который получает Приз согласно пункту 10 Правил.

**12. Информирование Победителя**

После проведения розыгрыша Организатор уведомляет Победителя о выигрыше путем отправки письма-уведомления на адрес, указанный при заполнении Карты Участника. Письмо-уведомление отправляется не позднее 10 мая 2019 года.

Организатор также оставляет за собой право дополнительно уведомлять Победителя любым удобным ему способом: посредством СМС-рассылки или звонка по телефону, указанному при заполнении Карты Участника.

**13. Результаты проведения Рекламной игры публикуются в газете «Звязда» в срок до 25 мая 2019 года включительно.**

**14. Место, порядок и срок выдачи Приза**

Для получения Приза Победителю необходимо не позднее 3 июня 2019 года прибыть в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Кульман, д. 40. Дату и время прибытия предварительно согласовать с представителем Организатора по телефону +375445954832 (стоимость звонка тарифицируется в соответствии с тарифами мобильного оператора, услугами которого пользуется Победитель).

Для получения приза Победителю необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность.

Выплата денежного эквивалента Приза не осуществляется.

Организатор не оплачивает Победителю расходы, связанные с прибытием к месту получения Приза.

В случае если Приз не получен в установленные Правилами сроки, либо с Победителем не удается связаться и уведомить о выигрыше из-за некорректных и (или) недостоверных данных, либо Победитель не явился за получением Приза, то Приз остается в распоряжении Организатора.

**15. Прочие условия**

Участие в Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все условия и требования.

Факт участия в Рекламной игре означает, что Участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты Участникам какого-либо вознаграждения.

Победитель дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные мероприятия принадлежат Организатору.

**16. Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры**

+375 44 595 48 32 ежедневно с 9.00 до 21.00

Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 3482 от 07.02.2019 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь

## Извещение о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| | |
|---|---|
| Дата, время и место проведения аукциона | **14 марта 2019 г.** в 14.00, г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15, Мядельский сельский исполнительный комитет |
| Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов | г. Мядель, ул.17 Сентября, д. 7, каб. 16, Мядельский сельский исполнительный комитет, тел. (8-01797) 55-7-35, тел./факс (8-01797) 55-7-36. С момента опубликования извещения до 16.00 12 марта 2019 г. В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| Порядок осмотра земельных участков на местности | В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| Условия проведения аукциона | Наличие не менее двух участников |
| Продавец | Мядельский сельский исполнительный комитет |
| Организатор аукциона | Мядельский сельский исполнительный комитет: **г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15-16, тел. (8-01797) 55-7-35, тел./факс (8-01797) 55-7-36** |
| Размер задатка и документы, представляемые для участия в аукционе | Размер задатка: 10 % от начальной цены. Документы: заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ удостоверяющий личность, для юридического лица – копия свидетельства о государственной регистрации. Реквизиты: р/с BY54AKBB36410619001106100000 ОАО «АСБ Беларусбанк», ЦБУ № 619 филиала 601, г. Молодечно, код AKBBBY21601, УНН 600380436, код платежа – 04901 |
